WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

12 ЛІСТАПАДА 2009 г.
ЧАЦВЕР
№ 214
(26572)

Кошт 600 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

АДБУДУЦЦА ПЕРАМОВЫ ЛІДАРАЎ АЗЕРБАЙДЖАНА І БЕЛАРУСІ

12 лістапада ў рамках афіцыйнага візіту ў нашу краіну Прэзідэнта Азербайджанскай Рэспублікі Ільхама Аліева адбудуцца перамовы лідараў Азербайджана і Беларусі.

Аляксандр Лукашэнка і яго азербайджанскі калега абмяркуюць увесь комплекс двухбаковых адносінаў спачатку ў фармаце перамоваў адзін на адзін, а затым у пашыраным фармаце. Асноўнымі тэмамі перамоў стануць развіццё гандлёва-эканамічных адносінаў, умацаванне культурных і гуманітарных сувязяў, міжрэгіянальнае і галіновае супрацоўніцтва. Па выніках перамоў будзе падпісаны шэраг сумесных дакументаў.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

УКЛАДЧЫКІ ЦІКАВЯЦЦА РУБЛЁМ

Дэпазіты ў нацыянальнай валюце набліжаюцца да ўзроўню пачатку гэтага года

У кастрычніку рублёвыя ўклады насельніцтва ў беларускіх банках у параўнанні з папярэднім месяцам значна выраслі: калі за верасень дэпазіты ў нацыянальнай валюце папоўніліся прыкладна на 104 мільярды, то ў мінулым месяцы — ужо на 319 мільярдаў 264 мільёны, што больш як у тры разы.

Нягледзячы на тое, што даходнасць як па рублёвых, так і па валютных укладах у асноўным захоўваецца на ранейшым узроўні, мяркуючы па апошніх звестках Нацыянальнага банка, прыярытэты людзей цяпер скіраваныя менавіта ў бок нацыянальнай валюты. Зусім нядаўна сітуацыя, нагадаем, была іншай: усе добра памятаюць, як рублёвыя ўклады «падкасіла» аднаразовая дэвальвацыя айчыннай валюты, калі насельніцтва тэрмінова забірала грошы з дэпазітаў, каб абмяняць іх на тавары альбо на замежную валюту. Аднак цяпер пануе ўжо супрацьлеглая тэндэнцыя — назіраецца істотны рост дэпазітаў у нацыянальнай валюце, якія на пачатку лістапада склалі каля 7 трыльёнаў 520 мільярдаў рублёў. Нагадаем, што ў студзені гэтага года на рублёвых укладах ляжала каля 7 трыльёнаў 731 мільярда рублёў, гэта значыць, іх аднаўленне не за гарамі. Як зазначыў у гутарцы з карэспандэнтам «Звязды» намеснік начальніка Упраўлення інфармацыі Нацыянальнага банка Міхаіл Журавовіч, зменлівасць «густаў» трымальнікаў дэпазітаў тлумачыцца вельмі проста. Людзі сталі больш размяшчаць сваіх сродкаў ва ўклады ў беларускіх рублях, па-першае, з-за высокіх працэнтных ставак, якія прапануюць па іх банкі. Даходнасць тэрміновых рублёвых укладаў па-ранейшаму захоўваецца ў сярэднім каля 20 працэнтаў і значна перавышае працэнты па валютных, па якіх прапануецца ў сярэднім 8 працэнтаў гадавых.

Між іншым, параўнальна сціплая даходнасць укладаў у замежнай валюце стала вынікам таго, што у мінулым месяцы, нягледзячы на іх агульны рост, насельніцтва папоўніла валютныя дэпазіты ўсё ж такі меншай сумай, чым у верасні — у пераразліку на беларускія рублі на 22 мільярды. У той час, як рублёвыя дэпазіты ўзраслі за кастрычнік на 4,4 працэнта, валютныя — толькі на 0,5 (на 18,4 мільёна долараў ЗША). Мабыць, не надае аптымізму ўкладчыкам, якія раней арыентаваліся на СКВ, і тое, што робіцца цяпер з доларам, асноўнай валютай, на якую ставілі людзі, калі неслі ў банкі свае «заначкі». Пасля непрацяглай спробы аднавіць страчаныя пазіцыі ў адносінах да еўра, курс «амерыканца» зноў «паплыў». Сёння яго афіцыйны курс у рэспубліцы вызначаны на ўзроўні 2710 рублёў за адзін долар (калісьці ён вагаўся каля лічбы 2850). Таму зберагаць у валюце пры цяперашнім зніжэнні курсу долара і высокім кошце еўра, як бачна, ахвотных менш.

Каментуючы вынікі дзесяці месяцаў адносна ўсіх укладаў насельніцтва, Міхаіл Журавовіч паведаміў, што яны за студзень — кастрычнік павялічыліся на 29 працэнтаў — больш як на 3 трыльёны 840 мільярдаў рублёў. На пачатак лістапада ўклады фізічных асобаў у банках перавысілі 17,1 трыльёна рублёў (у замежнай валюце дэпазіты складаюць амаль 3,5 мільярда долараў ЗША). У разліку на аднаго жыхара краіны з пачатку года зберажэнні, што трымаюць людзі ва ўкладах і ашчадных сертыфікатах, папоўніліся на 411 тысяч 600 рублёў: на 1 лістапада на аднаго беларуса прыпадала 1 мільён 813 тысяч 200 рублёў зберажэнняў, размешчаных у дэпазітах і сертыфікатах. На пачатак года адпаведная лічба раўнялася 1 мільёну 401 тысячы 600 рублям. За кастрычнік зберажэнні у разліку на аднаго жыхара папоўніліся 32 тысячамі 350 рублямі. Між іншым, калі параўноўваць з аналагічным вераснёўскім паказчыкам, згадаем і тое, што беларусы за месяц сталі куды больш ашчаднымі: у верасні на кожнага ў зберажэннях дадалося толькі 9 тысяч 150 рублёў. Зрэшты, ашчаднасць, хутчэй за ўсё, тут не галоўная прычына: у верасні людзі рыхтаваліся да зімы і трацілі грошы, запасаючыся той жа агародніной.

Ігар ШЧУЧЭНКА.

ПРАЙШЛІ СКРОЗЬ СЦЯНУ

Ноччу ў Мсціславе абакралі краму райпа. Два маладыя чалавекі — аднаму 21 год, а другому 23 — выбілі адзін сілікатны блок у сцяне крамы. Адзін пралез у памяшканне і падаваў іншаму харчы (у асноўным мясныя), гарэлку і віно, цыгарэты. Агульная сума скрадзенага — 850 тысяч рублёў. Затрыманых ужо раней судзілі.

Алена КАЗЛОВА.

Гаспадары

АФІЦЭРСКІ САД НА НІЧЫПАРАВАЙ ЗЯМЛІ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Ураджэнец Слуцка Юрый НІЧЫПАР свае першыя ўрокі па садаводстве атрымаў у дзяцінстве на бацькоўскім дачным участку. Цяпер ён сам — фермер-садавод. Шэсць гадоў жыве і працуе на Віцебшчыне і на 90 гектарах арандаванай зямлі гадуе саджанцы яблынь, парэчак і маліны. Карыстаючыся падтрымкай дзяржаўнай праграмы «Пладаводства», Юрый толькі сёлета прывіў болей за 15 тысяч цудоўных гатункаў беларускіх яблынь, а гатунак маліны «Бабіна лета» парадаваў яго двума выдатнымі ўраджаямі смачнай ягады. Ягоныя саджанцы ведаюць цяпер у розных кутках Беларусі. Нават не верыцца, што зусім нядаўна Юрый Нічыпар з'яўляўся афіцэрам-ракетчыкам Узброеных Сілаў.

Уладзімір Макей незадаволены работай чыноўнікаў Віцебска з грамадзянамі

Рабочая група Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі 10—11 лістапада без папярэджання правяла рэйдавую праверку работы выканаўчых і распарадчых органаў улады ў Віцебску па выкананні патрабаванняў Дырэктывы № 2 «Аб мерах па далейшай дэбюракратызацыі дзяржаўнага апарату», паведамілі БЕЛТА ў Адміністрацыі кіраўніка дзяржавы.

У ходзе праверкі ўстаноўлена, што старшыня Віцебскага гарвыканкама Віктар Нікалайкін прыём грамадзян па асабістых пытаннях пачаў з 1,5-гадзінным спазненнем. У выніку ўтварылася чарга каля 10 чалавек. Інфармацыі аб змене графіка прыёму размешчана не было.

На рабочым месцы не было начальніка аддзела па працы і сацыяльнай абароне Віцебскага гарвыканкама Алены Капусцінай, якая таксама павінна была весці прыём грамадзян па асабістых пытаннях.

«Ёсць дакладны рэгламентаваны парадак прыёму грамадзян па асабістых пытаннях, зацверджаны Прэзідэнтам Беларусі, які неабходна няўхільна выконваць. Гэта святая справа для кожнага кіраўніка», — сказаў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Уладзімір Макей.

Акрамя таго, былі выяўлены наступныя недахопы.

СТАР. 2

ПО ПОРУЧЕНИЮ КОНЦЕРНА «БЕЛЛЕСБУМПРОМ» (ПРОДАВЕЦ) КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ» (ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОНА)

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже **микроавтобуса Фольксваген «Каравелла»**, 1998 г.в. (двигатель/объем: бензин, 2500 см³). Начальная цена с НДС – 14 595 293 бел. руб. Задаток в размере 10 % от начальной цены перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015. Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 5 дней со дня подписания протокола о результатах аукциона. Оплата за объект производится в течение 10 дней со дня проведения аукциона. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **15.12.2009 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **14.12.2009 г.** до 17.00 по указанному адресу.

**Контактные телефоны: (8017) 224 61 34, 500 47 12.
Сайт в интернете: www.rlt.by.**

Прамая лінія

ВРВІ і грып

Прафілактыка і лячэнне вострых рэспіраторных вірусных інфекцый, грыпу, а таксама ўскладненняў, абумоўленых гэтымі захворваннямі, будуць у полі зроку нашай медыцынскай «прамой лініі». **18 лістапада,** у сераду, на вашы пытанні па нумарах: 8 (017) 292 38 92 і 292 38 21 **з 14.00 да 15.30** адкажа кандыдат медыцынскіх навук, дацэнт кафедры інфекцыйных хвароб Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі Святаслаў Алегавіч ВЕЛЬГІН.

Папярэднія пытанні можна пакінуць па нумарах 8 (017) 287 18 29 і 287 18 36.

Вымушаныя канікулы ў мінскіх школах загадана спыніць

Насуперак меркаванню сталічных эпідэміёлагаў, якія прапаноўвалі не аднаўляць заняткі ў мінскіх школах да будучага панядзелка, каб замацаваць дасягнуты раней эфект, Камітэт па адукацыі Мінгарвыканкама прыняў рашэнне распачаць заняткі ў агульнаадукацыйных установах горада з 12 лістапада.

Па падліках спецыялістаў, падаўжэнне канікулаў дазволіла папярэдзіць больш як 15 тысяч дадатковых выпадкаў захворвання на грып і ВРВІ сярод мінскіх школьнікаў. І калі сярод дарослага насельніцтва ўзровень захваральнасці за апошнія два тыдні вырас у 2,5 раза, то сярод дзяцей ён застаўся на тым жа ўзроўні. Цяпер у Мінску намецілася пэўная стабілізацыя эпідсітуацыі, ва ўсялякім разе ярка выражанага прыросту колькасці захварэлых не назіраецца. Аднак, як будзе развівацца сітуацыя далей, ніхто прагназаваць не бярэцца. Дзеці заўсёды былі «гаручым матэрыялам» падчас грыпознай эпідэміі. І для ўсіх было б лепш, каб яны заставаліся яшчэ нейкі час раз'яднаныя...

Тым часам Міністэрства аховы здароўя паведаміла пра зніжэнне па краіне колькасці захварэлых на вострыя рэспіраторныя інфекцыі. Як паведамляе афіцыйны сайт галоўнага медыцынскага ведамства, у панядзелак, 9 лістапада, колькасць звароташ хворых з прастуднымі сімптомамі зменшылася на 40,7 працэнта ў параўнанні з панядзелкам папярэдняга тыдня. Зменшылася таксама колькасць захварэлых на пнеўманію і колькасць шпіталізаваных у стацыянар. Праўда, ніякія канкрэтныя лічбы Міністэрствам аховы здароўя па-ранейшаму не агучваюцца. Невядомая ні колькасць захварэлых за папярэдні тыдзень, ні колькасць смяротных ахвяраў вострых вірусных інфекцый, ні колькасць хворых на пнеўманію. Невядома нават, у якіх кантрольных гарадах перавышаны на гэты момант эпіпарог, і ў якіх рэгіёнах спыненыя заняткі ў школах. Трэба заўважыць, што падчас апошняй эпідэміі грыпу такая інфармацыя абнаўлялася практычна штодня, і ніхто не рабіў з яе тайны.

Разам з тым у Міністэрстве аховы здароўя канстатуюць, што каранцінныя мерапрыемствы (падаўжэнне школьных канікулаў і спыненне навучальнага працэсу) дазволілі знізіць удзельную вагу дзяцей сярод захварэлых з 57,6 працэнта (па стане на 31 кастрычніка) да 45,9 працэнта (па стане на 9 лістапада).

Галоўнае медыцынскае ведамства таксама вырашыла праінфармаваць грамадзян, што фармацэўтычнае прадпрыемства «Лекфарм» ужо выпусціла больш як 100 тысяч упаковак «Арпетолу». У найбліжэйшыя дні, пасля праходжання кантролю якасці, «Арпетол» паступіць у аптэчную сетку краіны.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Парламенцкі дзённік

ІНВЕСТЫЦЫІ? РАСЧЫНІЦЬ ВОКНЫ І ДЗВЕРЫ!

Крытыкаў беларускай банкаўскай сістэмы, чаго граху таіць, доўга шукаць не давядзецца — вам любы мінак скажа, што на грошы, выплачаныя па крэдыце за халадзільнік, можна купіць як мінімум яшчэ адзін халадзільнік. Пры гэтым і стаўкі па дэпазітах зусім не такія высокія, як хацелася б... Здавалася б, і захады па лібералізацыі эканомікі робяцца, і спрыяльная нарматыўная база ствараецца, аднак чамусьці не так ужо і рвецца інвестар укладваць свае грошы ў тутэйшы бізнэс, ды і сам тутэйшы чалавек не спяшаецца аднесці свае грошы ў банк. Што зрабіць для таго, каб патрэбны эфект быў дасягнуты і сістэма працавала максімальна дзейсна, высвятлялі дэпутаты падчас чарговага навучальнага семінара. Народныя абраннікі наведалі музей і Цэнтральнае сховішча Нацбанка, ААТ «АСБ Беларусбанк», ААТ «Белагропрамбанк», ААТ «Пріорбанк». Вывучылі розныя аспекты функцыянавання банкаўскай сістэмы — пытанні грашова-крэдытнай палітыкі, валютнага рэгулявання і валютнага кантролю, нагляду за банкаўскай дзейнасцю. І з першых вуснаў атрымалі адказы на вострыя, хвалюючыя пытанні, якія перад імі ў сваю чаргу ставяць выбаршчыкі.

— Банкаўская сістэма і грашова-крэдытная палітыка аказваюць сур'ёзны ўплыў на дынаміку развіцця нацыянальнай эканомікі і шмат у чым вызначаюць якасць і ўзровень жыцця грамадзян нашай краіны, — адзначыў, адкрываючы семінар **старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА.** — Сёння банкі краіны актыўна ўдзельнічаюць у рэалізацыі прыярытэтных кірункаў развіцця нацыянальнай эканомікі: здзяйсняюць крэдытаванне рэальнага сектара, аказваюць крэдытную падтрымку малому і сярэдняму бізнэсу, насельніцтву. Пашыраецца крэдытаванне банкамі жыллёвага будаўніцтва, якое з'яўляецца лакаматывам эканамічнага росту.

Спікер нагадаў, што ў адпаведнасці з Праграмай сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2006—2010 гады стратэгічнымі кірункамі развіцця банкаўскай сістэмы з'яўляюцца павышэнне ўстойлівасці функцыянавання банкаўскага сектара, удасканаленне плацежнай сістэмы, рост патэнцыялу банкаў, уключаючы пашырэнне пераліку банкаўскіх паслуг, павышэнне даверу да банкаў з боку ўкладчыкаў, нацыянальных і замежных інвестараў, а таксама інтэграцыя банкаў Беларусі ў сусветную банкаўскую сістэму.

Сёння банкаўская сістэма Беларусі працуе ў няпростых умовах сусветнага фінансава-эканамічнага крызісу, — канстатаваў спікер. Пастаўлены задачы забяспечыць правядзенне гнуткай грашова-крэдытнай і валютнай палітыкі, стабільнасць і прадказальнасць дынамікі абменнага курсу беларускага рубля, умацаванне банкаўскай сістэмы ў цэлым. Кіраўнік ніжняй палаты парламента адзначыў сацыяльна значны эфект прыняцця шэрагу нарматыўных прававых актаў у банкаўскай сферы. Так, Закон «Аб гарантаваным пакрыцці банкаўскіх укладаў (дэпазітаў) фізічных асобаў», папраўкі ў які замацавалі гарантыю дзяржавы па пакрыцці грамадзянам банкаўскіх укладаў у поўным аб'ёме, дазволіў спыніць тэндэнцыю адтоку зберажэнняў у нацыянальнай валюце і іх «пераліву» ў дэпазіты ў замежнай валюце, якая намецілася.

Сярод мэтаў удасканалення банкаўскага заканадаўства палітык назваў умацаванне абароны інтарэсаў укладчыкаў, стварэнне ўмоў для прыцягнення зберажэнняў, а таксама замежных інвестыцый, развіццё інстытутаў, скіраваных на ўкараненне новых фінансавых інструментаў, неабходнасць удасканальваць сістэму рэгулявання і нагляду за дзейнасцю банкаў, развіваць рынак іпатэчных каштоўных папер і фондавы рынак. І, паводле слоў спікера, налета Палата прадстаўнікоў працягне работу па ўдасканаленні заканадаўства ў гэтым кірунку. У прыватнасці, запланаванае ўнясенне паправак у Банкаўскі кодэкс, а таксама ў законы «Аб эмісійных каштоўных паперах і прафесійных удзельніках рынку каштоўных папер» і «Аб дэпазітарнай дзейнасці і цэнтральным дэпазітарыі каштоўных папер у Рэспубліцы Беларусь».

— На мой погляд, надалей заслугоўвае разгляду і абмеркавання пытанне аб увядзенні новых інстытутаў, якія здольныя прыцягнуць у эканоміку краіны доўгатэрміновыя фінансавыя рэсурсы і палепшыць ліквіднасць банкаўскай сістэмы. Цяпер важнай задачай варта лічыць укараненне інстытута калектарскіх агенцтваў і яго прававое рэгуляванне, што, як паказвае практыка суседніх краін, дазволіць знізіць праблемную запазычанасць банкаў. Актуальным кірункам удасканалення банкаўскага заканадаўства з'яўляецца незалежнасць банкаўскага нагляду. Мяркую, над гэтымі і іншымі пытаннямі мы плённа папрацуем налета ў рамках удасканалення Банкаўскага кодэкса з улікам міжнароднай практыкі і рэкамендацый Сусветнага банка і Міжнароднага валютнага фонду.

Асобныя ж моманты будуць дасканала прааналізаваныя ў самы блізкі час — на парламенцкіх слуханнях па тэме «Стан і перспектывы развіцця заканадаўства ў сферы жыллёвага крэдытавання насельніцтва», якія адбудуцца 25 лістапада.

Старшыня праўлення Нацбанка Беларусі Пётр ПРАКАПОВІЧ:

— Мы павінны адкрыць краіну для інвестыцый — не толькі для замежных, але і для ўнутраных. Мы павінны расчыніць вокны і дзверы для прыцягнення інвестыцый. Каб увайсці ў колькасць найбольш развітых краін свету, мы павінны існы ВУП на душу насельніцтва павялічыць мінімум у тры разы.

Каб зрабіць гэта сваімі сіламі, спатрэбяцца многія дзесяцігоддзі, — канстатаваў П. Пракаповіч, і дзеля паскарэння працэсу якраз і неабходна прыцягваць інвестараў. Варта вырашыць пытанні павышэння канкурэнтаздольнасці тавараў і паслуг на міжнародных рынках, а гэта значыць — правесці мадэрнізацыю дзейных прадпрыемстваў, стварыць новыя кірункі ў эканоміцы. На думку старшыні праўлення Нацбанка, гэта павінны быць кірункі, якія не патрабуюць велізарных рэсурсаў, а заснаваюцца пераважна на чалавечым патэнцыяле — бія-, нанатэхналогіі і г.д. Варта развіваць і тыя галіны, дзе маецца ўласная сыравіна. І ўсе гэтыя захады, разлічаныя на максімальнае забеспячэнне экспартнага патэнцыялу краіны, трэба зрабіць літаральна за 3—4 гады. «Каб максімум да 2014 года выйсці на ўстойлівае станоўчае сальда знешняга гандлю таварамі і паслугамі». І галоўны момант тут — менавіта прыцягненне інвестыцый. Пётр Пракаповіч зрабіў акцэнт на тым, што «нам як паветра патрэбныя велізарныя замежныя інвестыцыі, нам патрэбны бум замежных інвестыцый у Рэспубліцы Беларусь».

Ён нагадаў пра высокую планку — трапіць у трыццатку найлепшых краін па ўмовах вядзення бізнэсу, і дасягнуць яе варта ўжо налета. Вялікая роля тут адводзіцца і парламентарыям: «Стаіць задача прыняць да канца года ўсе неабходныя нарматыўныя акты, змяненні ў заканадаўства». Дарэчы, сёння дэпутаты будуць разглядаць у Авальнай зале праект закона аб падтрымцы малога і сярэдняга прадпрымальніцтва.

Старшыня праўлення Нацбанка мяркуе таксама, што «ў нас ёсць магчымасці на працягу наступных 10 гадоў выйсці на сярэднееўрапейскі ўзровень жыцця, а па заробках гэта каля дзвюх тысяч долараў». За кошт штогадовага высокага эканамічнага росту — 10—12 працэнтаў, росту прадукцыйнасці працы, дасягнення станоўчага сальда гандлю таварамі і паслугамі.

Зоя ВАРАНЦОВА.

ПІЯР З ПАДТЭКСТАМ

Як наведаць

АБЯЦАЮЧЫ БЯСПЛАТНУЮ РЭКЛАМУ Ў ЕЎРАПЕЙСКІМ БІЗНЭС-КАТАЛОГУ, «ДАБРАДЗЕІ» «СТРЫГУЦЬ» ПАСЛЯ ГРОШЫ З ДАВЕРЛІВЫХ КЛІЕНТАЎ

Ажно з ліпеня 2007-га і да сакавіка сёлетняга года ў краіне дзейнічала арганізаваная група махляроў, якія «штампавалі» для грамадзян падробныя дакументы на атрыманне ў банках спажывецкіх крэдытаў. Як выявілася, прайдзісветы выраблялі несапраўдныя даведкі аб даходах ад імя ПГВУП «Жуір», ГПУП «Алекском» і ЗВПУП «Ламантас», пры тым што апошнія не толькі не ажыццяўлялі фінансава-гаспадарчай дзейнасці, але да таго ж і не знаходзіліся па юрыдычным адрасе.

Згодна з інфармацыяй Камітэта дзяржбяспекі, якую Нацыянальны банк разаслаў камерцыйным банкаўскім установам, паведамляецца аб выніках расследавання супрацоўнікамі КДБ крымінальнай справы, якая была заведзена ў дачыненні да вышэйзгаданых дзялкоў. У прыватнасці, падчас расследавання было вызначана, што з дапамогай падробных даведак аб даходах, якія беларусы набывалі ў арыгінальных «бізнэсменаў», у банках было атрымана каля 122 крэдытаў на агульную суму больш як 1,9 мільярда рублёў. Прычым частка гэтых крэдытаў да гэтага часу не пагашаецца.

Як вынікае са звестак следства, хітруны, пра якіх ідзе гаворка, скарысталіся пэўнымі недахопамі ў сістэме праверкі дакументаў для атрымання крэдытаў фізічнымі асобамі, што замацаваныя ў лакальных нарматыўна-прававых актах асобных банкаў. Напрыклад, каб пацвердзіць факт выдачы даведкі аб узроўні даходу крэдытаатрымальніка, супрацоўнікі банка абавязваныя былі патэлефанаваць па месцы працы апошняга па нумары тэлефона, што пазначана ў даведцы. А насамрэч на званкі па тэлефонах згаданых юрыдычных асобаў ніхто не адказваў, а пры дазвонах да нібыта кіраўнікоў гэтых арганізацый па мабільніках супрацоўнікі банкаў размаўлялі з удзельнікамі арганізаванай групы, якія і выраблялі ўсе падробкі. Дзіўна, што пры праверцы плацежаздольнасці людзей, якія атрымлівалі крэдыт, у большасці выпадкаў банкі абмяжоўваліся толькі званком непасрэдна крэдытаатрымальніку, зацікаўленым у станоўчым вырашэнні пытання з крэдытам. Разам з тым, паведамляе КДБ, значная частка крэдытаатрымальнікаў, якія пазычылі сродкі ў банкаў па падробных даведках аб даходах, не маюць пастаяннага месца працы, ці ажыццяўляюць індывідуальную прадпрымальніцкую дзейнасць без афіцыйнай рэгістрацыі і пазбягаюць падаткаабкладання.

І калі па вышэйзгаданай справе расследаванне ўжо скончана і зроблены пэўныя высновы, то актывізацыя ва Усходняй Еўропе і краінах Балтыі дзейнасці шэрагу кампаній, у якой праглядаюцца прыкметы махлярства, можа ў будучыні прынесці непрыемнасці айчынным арганізацыям. Прынамсі, той жа Нацыянальны банк, абапіраючыся на звесткі Камітэта дзяржбяспекі, папярэджвае беларускія прадпрыемствы ад супрацоўніцтва з некаторымі замежнымі кампаніямі, якія прадстаўляюцца складальнікамі еўрапейскіх бізнэс-каталогаў.

Сутнасць жа махлярства, ахвярамі якога, дарэчы, за апошнія гады ў тых жа краінах Балтыі сталі каля 5 тысяч арганізацый, у лісце Нацбанка разглядаецца на прыкладзе дзеянняў кампаніі European Citi Guide (E.C.G). Так, напачатку гэтая кампанія накіроўвае арганізацыям прапанову запоўніць анкету і перасласць яе ў E.C.G з мэтай наступнай публікацыі інфармацыі ў буйным еўрапейскім бізнэс-каталогу (на папяровым носьбіце, кампакт-дыску і інтэрнэт-сайце). Своеасаблівай «прынадай» для патэнцыйных кліентаў з'яўляецца тое, што прапанова складзеная так, нібыта атрымальнік не нясе фінансавых расходаў на рэкламу. Больш за тое, каб надаць дакументу большую пераканаўчасць, да яго дадаецца канверт са зваротным адрасам, на які нанесены штамп, падобны на сімволіку Еўрасаюза. А праз пэўны час пасля адпраўкі анкеты кампанія раптоўна атрымлівае рахунак на 900—1000 еўра. Падставай жа для аплаты з'яўляецца наяўнасць подпісу на анкеце кіраўніка арганізацыі і пячаткі, што разглядаецца як фармальная згода з умовамі кантракта, у якім дробным шрыфтам у няпэўнай форме абгавorана неабходнасць нясення фінансавых расходаў. У тым жа выпадку, калі кампанія адмаўляецца плаціць, ёй накіроўваюцца пісьмы, а таксама тэлефануюць з пагрозамі ініцыяваць судовы разбор, уключыць у «чорны» спіс даўжнікоў і нязручных партнёраў, супрацоўніцтва з якімі непажаданае. Між іншым, за апошнія шэсць гадоў E.C.G. разаслала больш за 32 мільёны такіх пісьмаў.

Паводле звестак КДБ, акрамя E.C.G падобнымі хітрыкамі карыстаюцца некаторыя іншыя кампаніі, сярод якіх згадваюцца Novachannel AG, Construct Data (The Fair Guide), TVV Telefax Directory, International Business and Trade Databases, Intercable Verlag AG, IT T International Fax Directory, UTP Digital Directories, International Medical Information, Deutscher Adressdienst GmbH, EU Company Directory, Easy Pages Ltd Global Alliance S.L.

У галоўным банку краіны не выключаюць таго, што з пашырэннем міжнароднага супрацоўніцтва нашай краіны такога роду арганізацыі могуць актывізавацца і на тэрыторыі рэспублікі. Прынамсі, у КДБ ёсць інфармацыя, што некаторыя беларускія кампаніі ўжо атрымалі анкеты E.C.G. Зразумела, што падобныя выпадкі не з'яўляюцца тымі прапановамі, ад якіх няма магчымасці адмовіцца. Тым больш што сумны досвед іншых — добрая навука, каб не патрапіць на «вуду» махляроў.

Ігар ШЧУЧЭНКА.

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 12.11.2009 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	2 710,00
▲ 1 еўра	4 072,59
1 латвійскі лат	5 741,53
1 літоўскі літ	1 180,26
1 чэшская крона	160,41
1 польскі злоты	983,83
▲ 1 расійскі рубель	94,42
1 украінская грыўня	333,13

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РБ

USD	28,7007
UAH	35,0650
1000 BYR	10,5868
EUR	43,0424

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2009 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ДЖОН МЭЙДЖАР ЗАДУМАЎ ВЯРНУЦЦА Ў БРЫТАНСКІ ЎРАД

Былы прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі Джон Мэйджар разглядае магчымасць вяртання ў вялікую палітыку. Як піша The Daily Mail, Мэйджар можа пагадзіцца на месца ва ўрадзе Вялікабрытаніі, калі на выбарах 2010 года перамогу атрымаюць яго паплечнікі з Кансерватыўнай партыі.

Нагадаем, Джон Мэйджар стаў кіраўніком урада ў 1990 годзе, змяніўшы Маргарэт Тэтчэр. Перыяд яго працы адзначыўся шэрагам скандалаў вакол членаў урада, фінансавым крызісам і падзеннем папулярнасці кансерватараў.

УКРАІНА ЗАСТАЕЦЦА БЕЗ КРЭДЫТУ МВФ: ПАЛІТЫКІ НЕ МОГУЦЬ ДАМОВІЦЦА

Сакратарыяту прэзідэнта, кабінету міністраў і Нацыянальнаму банку Украіны не атрымоўваецца прыйсці да згоды з нагоды выканання праграмы stand by паміж Украінай і Міжнародным валютным фондам для атрымання Кіевам чацвёртага транша крэдыту МВФ. Пра гэта заявіў першы намеснік кіраўніка сакратарыята прэзідэнта Украіны Аляксандр Шлапак.

Ён адзначыў, што для МВФ закон аб павышэнні сацстандартаў не з'яўляецца галоўнай перашкодай для выдаткавання чарговага транша. «Што ж датычыцца наступнага года, — адзначыў Шпак, — то абавязкова трэба адклікаць закон аб бюджэце, які ў Раду ўнесены цяпер, паколькі ён катэгарычна не задавальняе МВФ з прычыны таго, што пабудаваны на нядзейнай базе». Чыноўнік адмовіўся спрагназаваць, калі Украіна зможа атрымаць чарговы транш ад МВФ.

МВФ плануе выдаткаваць Украіне чацвёрты транш крэдыту stand-by у памеры каля 3,71 млрд долараў 15 лістапада 2009 года. Аднак з прычыны невыканання ўкраінскім бокам шэрагу рэкамендацый МВФ, фонд заявіў аб намеры замарозіць усе адносіны з Кіевам да выбараў новага прэзідэнта і выбудоўваць адносіны ўжо з новай украінскай уладай. Выбары павінны прайсці ў студзені 2010 года.

НА РАХУНКАХ ПЕНСІЙНАГА ФОНДУ РФ НАЗАПАСІЛІСЯ МІЛЬЯРДЫ РУБЛЁЎ НЯБОЖЧЫКАЎ

На рахунках Пенсійнага фонду Расіі (ПФР) назапасіліся мільярды рублёў, якія павінны пайсці на выплаты спадчыннікам удзельнікаў сістэмы пенсійнага страхавання. Часта спадчыннікі папросту забываюць атрымліваць пенсіі сваіх памерлых сваякоў, піша газета «Час навін».

Так, у 2008 годзе ў аддзяленні ПФР звярнуліся і атрымалі сродкі з назапашвальных рахункаў сваіх памерлых сваякоў 96,5 тысячы спадчыннікаў, якім было выплачана 443,7 мільёна рублёў. Пры гэтым агульная сума выплат была закладзеная ў бюджэце ПФР на ўзроўні 2 мільярдаў рублёў. У 2009 годзе да першага верасня ПФР выплаціў 496 мільёнаў рублёў, хоць у бюджэце на гэтыя мэты зарэзервавана 2,9 мільярда рублёў.

Эксперты, апытаныя выданнем, лічаць, што адсутнасць у спадчыннікаў цікавасці да назапашванняў сваякоў у ПФР звязана з тым, што большасць спадчыннікаў папросту не чула аб такой магчымасці.

БЕРЛУСКОНІ ЗНАЙШОЎ СПОСАБ ПАЗБЕГНУЦЬ СУДА

Прэм'ер-міністр Італіі Сільвіа Берлусконі мае намер унесці ў парламент законапраект, які паменшыць тэрмін даўнасці па карупцыйных злачынствах з 10 да 6 гадоў. Пра гэта 11 лістапада паведамляе The Times.

Берлусконі ўжо дамовіўся аб падтрымцы законапраекта са сваім галоўным апанентам, спікерам парламента Джанфранка Фіні. У кастрычніку 2009 года Канстытуцыйны суд Італіі пазбавіў прэм'ера недатыкальнасці. Гэта азначае, што на працягу лістапада супраць Берлусконі будуць адноўленыя дзве прыпыненыя раней справы. У выпадку, калі тэрмін даўнасці пераследу за карупцыю скароціцца, то тэрмін даўнасці абедзвюх спраў будзе лічыцца мінулым.

Беларусь мае намер больш інтэнсіўна ствараць вытворчасці беларускай тэхнікі ў Азербайджане

Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 9 лістапада ў інтэрв'ю азербайджанскаму інфармацыйнаму агенцтву Trend News, якое адбылося напярэдадні візіту ў Беларусь Прэзідэнта Азербайджана Ільхама Аліева.

Прэзідэнт падкрэсліў, што перспектывы такога ўзаемадзеяння вельмі вялікія. «Мы ні ў адной краіне не адчувалі такой падтрымкі пры стварэнні гэтых прадпрыемстваў, як у вас. Спачатку былі зборачныя вытворчасці, потым выйшлі на лакалізацыю. Азербайджан — апора на Каўказе, і мы будзем развіваць там базу і ствараць вытворчасці, напрыклад, аўтакранаў, гатовы вырабляць ліфты, сельгастэхніку», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

«Мы гатовы працаваць і адкрываць свае вытворчасці, калі ў гэтым будзе цікавасць азербайджанскага боку, а яна ёсць», — адзначыў Прэзідэнт. Ён таксама дадаў, што Беларусь «навучылася з тэрыторыі Азербайджана гандляваць з трэцімі краінамі». «Думаю, мы знойдзем падтрымку з боку Прэзідэнта Азербайджана. І будзем яшчэ больш інтэнсіўна развіваць вытворчасць беларускай тэхнікі на азербайджанскай зямлі. Ад гэтага вы толькі выйграеце. У вас толькі ўзнімецца сельская гаспадарка, а для таго, каб ажыццявіць бурны рост, без тэхнікі не абысціся» , — сказаў беларускі лідар.

Прэзідэнт падкрэсліў, што калі азербайджанскі рынак не мае патрэбы ў такой колькасці беларускай прадукцыі, то там неабходна ствараць сумесныя вытворчасці і гандляваць з Азербайджана з трэцімі краінамі, што дзяржавы сёння паспяхова і робяць: у галіне тэхнікі, электронікі, оптыкі, радыёэлектронікі, навукаёмістых вытворчасцяў.

Закранаючы плануемы ў найблізжэйшы час візіт у Беларусь Прэзідэнта Азербайджана Ільхама Аліева, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што чакае гэтай сустрэчы. «Мы сфарміравалі добрую нарматыўна-прававую базу, у нас няма праблем у супрацоўніцтве ўрадаў, ведамстваў, прадпрыемстваў, прадстаўнікоў бізнэсу, — адзначыў Прэзідэнт. — Мы чакаем ад візіту, што агаворым многія праблемы, якія нададуць дынаміку і дадатковы імпульс нашаму супрацоўніцтву».

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што для Беларусі вельмі важна дыверсіфікаваць пастаўкі вуглевадародаў сыравіны. «Расія — дружалюбная нам краіна, але мы не можам залежаць толькі ад аднаго пастаўшчыка», — сказаў ён. Кіраўнік дзяржавы расказаў, што пралічваўся і маршрут пастаўкі нафты праз Украіну, гэта пытанне, у прыватнасці, доўга абмяркоўвалася і ў час апошняй сустрэчы з Прэзідэнтам Украіны Віктарам Юшчанкам у Кіеве.

Гаворачы аб пастаўках праз нафтаправод «Адэса — Броды», Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што гэты варыянт магчымы. «Мне здаецца, гэты варыянт магчымы, і абсалютна без праблем мы можам паставіць у Мазыр вельмі якасную каспійскую нафту. Вядома, трэба мець на ўвазе, што гэта будзе ўварванне ў рынак, які ўжо афарміўся. Тут дзяржавы ўжо даўно гандлююць, склаліся пэўныя сувязі, гэта працэс няпросты», — адзначыў Прэзідэнт.

«Таму мы пралічваем гэтыя варыянты, і як толькі мы дамовімся і гэта эканамічна будзе выгадна, то неадкладна пачнём рэалізоўваць гэты праект», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. «Зацікаўленасць Азербайджана, Прыкаспійскіх дзяржаў, Украіны і Беларусі ў гэтым ёсць», — дадаў ён.

Беларусь гатова аказаць садзейнічанне ў станоўчым вырашэнні канфлікту ў Нагорным Карабаху, заявіў Аляксандр Лукашэнка.

«Калі мы штосьці можам у гэтым плане зрабіць — мінская група АБСЕ, Беларусь, беларускі народ — калі мы можам штосьці станоўчае прыўнесці ў вырашэнне гэтага пытання, мы з задавальненнем гэта зробім», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Аднак кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што вырашыць гэту праблему могуць толькі два прэзідэнты — Арменіі і Азербайджана. «Толькі прэзідэнты гэтых краін могуць вырашыць гэту праблему. Як? Толькі ў інтарэсах тых людзей, якія там засталіся. Не могуць яны ў такіх умовах жыць і ў такой сітуацыі, — лічыць Аляксандр Лукашэнка. — Мы падтрымліваем працэс у тым напрамку, што гэта павінны вырашыць дзве дзяржавы, два прэзідэнты, два народы».

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што Беларусь не можа дыстанцыравацца ад праблем рэгіянальных канфліктаў на тэрыторыі СНД, Прыднястроўе гэта, Крым або Нагорны Карабах, паколькі ўсе калісьці жылі ў адной дзяржаве.

Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і БЕЛТА.

Уладзімір Макей незадаволены работай чыноўнікаў Віцебска з грамадзянамі

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У гарвыканкаме не наладжана электроннае ўзаемадзеянне з іншымі структурнымі падраздзяленнямі і арганізацыямі пры ажыццяўленні адміністрацыйных працэдур (выключэнне РУП «Віцебскае агенцтва па дзяржаўнай рэгістрацыі і зямельнаму кадастру»). Запыты накіроўваюцца на папяровых носьбітах, што не забяспечвае хуткага атрымання інфармацыі ад іншых органаў. Сайт гарвыканкама змяшчае неактуальную інфармацыю аб парадку ажыццяўлення адміністрацыйных працэдур гарвыканкамам і яго структурнымі падраздзяленнямі.

«Гарачая лінія» Віцебскага гарвыканкама працуе толькі адзін дзень у месяц, і пры гэтым ні адзін пазначаны тэлефон не адказваў. Рабочая група таксама наведала ЖЭУ № 1 і № 2 Віцебска. У гэтых арганізацыях адсутнічаюць элементарныя ўмовы для прыёму наведвальнікаў і іх належнага абслугоўвання. Памяшканні захламлены, патрабуюць рамонту, сцены абвешаны бессістэмнай і не заўсёды актуальнай інфармацыяй. У гэтых ЖЭУ няма пераліку адміністрацыйных працэдур, якія ажыццяўляюцца ў адносінах да грамадзян. Работнікі не могуць растлумачыць механізм ажыццяўлення такіх працэдур. У ЖЭУ № 2 адсутнічалі асобы, адказныя за выкананне адміністрацыйных працэдур, і не была забяспечана іх замена. Інфармаванне грамадзян у гэтых арганізацыях ажыццяўляецца фармальна.

Устаноўлена таксама, што выкарыстанне дзяржаўнымі органамі і арганізацыямі такога важнага канала зваротнай сувязі з грамадзянамі, як кніга заўваг і прапаноў, ажыццяўляецца неэфектыўна. Прычына такіх адносінаў у адным — слабая выканальніцкая дысцыпліна і нізкі ўзровень персанальнай адказнасці асобных службовых асобаў дзяржаўных органаў. Такім чынам, галоўная мэта Дэкрэта № 2 — наладзіць прамую сувязь з людзьмі — пакуль не дасягнута.

Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта даручыў кіраўніцтву Віцебскага аблвыканкама і Віцебскага гарвыканкама прыняць усе неабходныя меры па навядзенні парадку і строгім выкананні Дырэктывы № 2. Вынікі праверкі яшчэ раз пацвердзілі, што пытанні работы з насельніцтвам павінны быць у цэнтры ўвагі мясцовых органаў улады. Чыноўнік павінен быць залежны ад ацэнкі якасці яго работы грамадзянамі. Адміністрацыя Прэзідэнта Беларусі прадоўжыць практыку правядзення аналагічных раптоўных праверак па пытаннях дэбюракратызацыі дзяржаўнага апарату ў іншых рэгіёнах.

НЕЗАКОННА ПРАЗ МЯЖУ СА ЗБРОЯЙ

На возеры Белае ў Драгічынскім раёне работнікі Пінскай міжрайінспекцыі сумесна з вайскоўцамі Пінскага пагранатрада затрымалі 11 грамадзян Украіны, якія на пяці лодках знаходзіліся на тэрыторыі нашай краіны.

У аднаго з затрыманых — жыхара горада Камень-Кашырскі — канфіскавана паляўнічая стрэльба і 36 паляўнічых патронаў да яе. На месца выклікалі работнікі Пінскай мытні, якім былі перададзены стрэльба і боепрыпасы. За незаконнае перасячэнне дзяржаўнай мяжы са зброяй і боепрыпасамі ў дачыненні да ўладальніка вырашаецца пытанне аб узбуджэнні крымінальнай справы.

Сяргей РАСОЛЬКА.

КАНТРАФАКТНЫЯ ДЫСКІ НА 121 МІЛЬЁН РУБЛЁЎ

У Наваполацку ў трох індывідуальных прадпрымальнікаў міліцыянеры знайшлі рэкордную па сваім кошце партыю кантрафактнай відэапрадукцыі на дысках — коштам каля 121 мільёна рублёў. Канфіскавалі 10,8 тысячы дыскаў, якія планавалі рэалізаваць. Праводзіцца праверка.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ПРЭЗІДЭНТ БЕЛАРУСІ ЎЗНАГАРОДЗІЎ ПАГРАНІЧНІКАЎ, МЫТНІКАЎ І ФІНАНСАВЫХ КАНТРАЛЁРАЎ МЕДАЛЁМ «ЗА БЕЗДАКОРНУЮ СЛУЖБУ»

Прэзідэнт Беларусі ўзнагародзіў за ўзорнае выкананне службовых абавязкаў ваеннаслужачых пагранічнай службы, а таксама супрацоўнікаў мытнай службы і Камітэта дзяржкантролю медалём «За бездакорную службу» I, II, III ступені. Указ аб гэтым Аляксандр Лукашэнка падпісаў 9 лістапада.

У прыватнасці, медалём «За бездакорную службу» I ступені адзначаны Сяргей Шкода, палкоўнік юстыцыі Уладзімір Бабак, падпалкоўнік Аляксандр Шчарбакоў.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Минский городской центр недвижимости

УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»

ПОВТОРНО ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже единым лотом имущества детского оздоровительного лагеря «Бригантина» (балансодержатель – УП «Завод точного машиностроения «Планар-ТМ»), расположенного по адресу: Минская область, Молодечненский район, 0,5 км севернее д. Петровщина, детский оздоровительный лагерь «Бригантина». В состав лота входит следующее имущество:

№ п/п	Наименование объектов	Инв. №
1.	Физкультурно-оздоровительный комплекс (общая площадь – 283,7 кв.м)	630/С-47603
2	Котельная с навесом (общая площадь – 396,4 кв. м)	630/С-47604
3	Детсад-ясли корпус № 1 (общая площадь – 1276,0 кв. м)	630/С-47605
4	Трансформаторная подстанция (общая площадь – 18,0 кв. м.)	630/С-47607
5	Административно-приемный корпус (общая площадь – 101,1 кв. м)	630/С-47608
6	Детсад-ясли на 140 мест корпус № 2 (общая площадь – 1096,1 кв. м)	630/С-47609
7	Здание специализированное для лечебно-профилактических и санаторно-курортных целей (общая площадь – 732,4 кв. м)	630/С-49350
8	Здание специализированное для общественного питания (общая площадь – 1749,6 кв. м)	630/С-49353
9	Здание специализированное для лечебно-профилактических и санаторно-курортных целей (общая площадь – 735,4 кв. м)	630/С-49354
10	Канализационно-насосная станция (общая площадь – 23,5 кв. м)	630/С-47570
11	Склад (общая площадь – 165,1 кв. м)	
12	Бытовое здание для обслуживающего персонала (общая площадь – 131,8 кв. м)	
13	Кабельная линия	
14	Внешние кабельные сети	
15	Наружное освещение	
16	Наружные сети тепловые, водопроводные и т.п.	
17	Наружная канализация	
18	Водопровод с артскважиной	
19	Водонапорная башня	
20	Устройство подъездной автодороги	
21	Ограждение с воротами	
22	Противопожарный подъезд к водоему	
23	Котел Минск-1	
24	Котел Минск-1	
25	Теплообменник Р-025-8,9-1Х	
26	Лифт грузовой малый	
27	Лифт грузовой г/п 100 кг	
28	Таль электрическая МЗ-320	

Начальная цена – 1 824 327 605 белорусских рублей.

Земельный участок площадью 11,75 га (в том числе: земельный участок площадью 10,3544 га, кадастровый номер 623881300098000008, земельный участок площадью 0,0232 га, кадастровый номер 62388130098000007, земельный участок площадью 1,3754 га, кадастровый номер 623881300098000009) предоставлен для эксплуатации и обслуживания зданий и сооружений детского оздоровительного лагеря «Бригантина».

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, условиями проведения аукциона; нотариально заверенные копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного документа, подтверждающего внесение задатка; а также иные документы в соответствии с условиями проведения аукциона.

Задаток в размере 180 000 000 белорусских рублей перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, бульвар им. В. Мулявина, 6, код 153001331; УНП 190398583.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый объект. Порядок проведения торгов указан в условиях проведения аукциона.

Аукцион состоится **30 ноября 2009 года в 16.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 12.11.2009 по 27.11.2009** в рабочие дни с 09.00 до 18.00 (в пятницу – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок: (017)227 48 36, 227 40 22.

Минский городской центр недвижимости

УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»
16 декабря 2009 года

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже единым лотом имущества УИПЧП «Сивва-М», расположенного по адресу: Минская обл., Логойский р-н, г/п Плещеницы, ул. Партизанская, д. 26. В состав лота входит следующее имущество:

№ п/п	Наименование объекта
1.	Одноэтажный кирпичный материальный склад общей площадью 345,7 кв. м (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, инв. номер 601/С-14226)
2.	Одноэтажная кирпичная проходная общей площадью 9,5 кв. м (здание неустановленного назначения, инв. номер 601/С-14269)

На имущество, входящее в состав лота, обращено взыскание в счет неисполненного налогового обязательства.

Имущество, входящее в состав лота, расположено на земельном участке с кадастровым номером 623255700001001557 (присвоен предварительно).

Начальная цена лота – 84 233 400 белорусских рублей.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы: заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона; копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения, подтверждающего внесение задатка; а также иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток в размере 8 400 000 белорусских рублей перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, бульвар им. В. Мулявина, 6, код 153001331; УНП 190398583.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый объект. Процедура проведения торгов установлена порядком проведения аукциона.

Оплата объекта осуществляется в течение срока, указанного в протоколе о результатах аукциона. Аукцион состоится **16 декабря 2009 года** в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 12.11.2009 по 14.12.2009** в рабочие дни с 09.00 до 18.00 (в пятницу – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефон для справок: (017) 227 40 22. www.mgcn.by.

Сэкс-інфарм

КАБ СПЕРМАГРАМА БЫЛА ДОБРАЙ...

З надыходам палавой спеласці мужчынскія ганады (яечкі) беспарапынна выпрацоўваюць да 1500 сперматазоідаў у секунду, або на 1 г вагі яечка ўтвараецца звыш 10 млн сперматазоідаў у суткі. Мяркуецца, што паўнавартасныя сперматазоіды з'яўляюцца да 15-16-гадовага ўзросту, хоць у свеце налічваецца тысячы бацькаў і маладзейшых за гэты ўзрост.

Нармальны сперматагенез магчымы пры стабільнай тэмпературы 33—34 градусы, што і забяспечвае такі ўнікальны орган мужчыны, як машонка. Шматлікія вопыты на жывёлах паказалі, што нават пасля змяшчэння яечка ў брушную поласць або цёплую ваду хоць бы на нейкі час літаральна праз 2 тыдні адзначаецца перараджэнне семявых канальцаў яечка і зніжненне сперматазоідаў. Гэты факт пацвярджаецца і ў выпадках крыптархізму (не апускання яечка ў машонку), і пры працяглых захворваннях з павышанай тэмпературай, па завяршэнні якіх сперматагенез дасягае сваіх нарматыўных паказчыкаў толькі праз некалькі месяцаў. Ёсць аб чым задумацца і аматарам парылкі. Пагаршэнне сперматагенезу выклікаецца таксама прамянёвым пашкоджаннем яечак, недахопам кіслароду або вянозным застоем — напрыклад, пры варыкозным расшырэнні венаў семявага канаціка — варыкацэле, безбялковым харчаванні і працяглым галаданнем, дэфіцытам вітамінаў, асабліва вітаміну Е і частым ужываннем алкаголю.

Вядучая рубрыкі Святлана БАРЫСЕНКА.

P.S. *Інфармацыйнае забеспячэнне рубрыкі — сэкспалага Мінскай вобласці Дзмітрыя КАПУСЦІНА.*

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

ГОСУДАРСТВЕННОЕ ПРОИЗВОДСТВЕННОЕ ОБЪЕДИНЕНИЕ «МИНСКСТРОЙ»

220050, г. Минск, ул. К. Маркса, 13А, режим работы: с 8.30 до 17.45, перерыв 13.00–14.00, тел. приемной 227 78 70, тел. 227 52 36, 226 03 01

Зарегистрировано решением Мингорисполкома от 18 января 2007 г. № 140 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей № 100071325.

Выполняя функции заказчика, объединением с 2004 по 2008 год построены и введены в эксплуатацию жилые дома:

- ул. Захарова, д. 63, ул. Захарова, д. 67, корп. 1, ул. Великоморская, д. 10, ул. Великоморская, д. 12, ул. Роменская, д. 5, ул. Матусевича, д. 90, пр-т Рокоссовского, д. 78, пр-т Рокоссовского, д. 76, пр. Рокоссовского, 80, ул. Филимонова, д. 14, пр-т Независимости, д. 168, корп.1, пр-т Независимости, д. 168, корп. 2, ул. Есенина, д. 30, ул. Есенина, д. 34, ул. Есенина, д. 36.

Объединение осуществляет строительство объекта «Многоэтажные жилые дома № 1, 2 по генплану со встроенными помещениями административно-общественного назначения и гаражом-стоянкой № 3 по генплану в квартале ул. Щорса – пр. Дзержинского с установкой индивидуального источника теплоснабжения. Жилой дом № 1 по генплану. Крышная газовая котельная № 4 по генплану. Повысительная насосная станция № 5 по генплану. Трансформаторная подстанция № 6 по генплану» в г. Минске.

Лицензия № 02250/0264117 выдана Министерством архитектуры и строительства РБ 09.04.2007 года сроком на пять лет.

Здание жилого дома запроектировано из трех секций. На первом этаже запроектировано нежилое помещение. Количество жилых помещений жилого дома – 125, количество нежилых помещений – 1.

Начало строительства – декабрь 2008 года.

Окончание строительства – декабрь 2009 года.

Проектно-сметная документация прошла в установленном порядке:

- государственную экспертизу от 25.08.2008 года № 1975-5/08,

- государственную экологическую экспертизу 31.07.2008 года № 02-11/490.

Свидетельство о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права на него от 19.11.2008 г. № 500/147-4559.

Земельный участок площадью 0,2285 га. Проектом предусмотрено устройство подъездов, пешеходных связей, установка малых архитектурных форм, озеленение, организация детских игровых, спортивных, хозяйственных площадок.

Больш за тое, паводле інфармацыі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, сёлета ў Мінску зарэгістравана 58 фактаў, калі аўтамабілі, прыпаркаваныя на тратуарах і прылеглых да дамоў дарогах, перашкаджалі тушыць пажары.

За 9 месяцаў у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года вырасла і колькасць крадзяжоў маёмасці грамадзян з аўтамабіляў з 6307 да 8832. Большая іх частка здзейснена з аўтамабіляў, прыпаркаваных менавіта на ўнутрыдваровых тэрыторыях жылых масіваў. Пры гэтым 70 працэнтаў крадзяжоў ад ліку зарэгістраваных прыпадаюць на сталіцу.

У сувязі з гэтым Генеральная пракуратура і накіравала ліст са сваімі прапановамі ў Мінгарвыканкам і ў Міністэрства ўнутраных спраў.

— У прыватнасці, Генпракуратура прапанавала органам унутраных спраў распрацаваць інфармацыйныя лісткі, дзе быў бы названы максімальны памер штрафу за паркоўку ў забароненым месцы і кошт прымусовай эвакуацыі транспартнага сродку, — распавядаюць у Генпракуратуры. — Работнікі ж ЖЭСаў маглі б гэтыя папярэджанні размяшчаць на лабавым шкле аўтамабіляў, прыпаркаваных з парушэннем ПДР. А пры паўторным парушэнні — аператыўна перадаваць інфармацыю аб марцы аўто і яго рэгістрацыйным нумары ў ДАІ для прыняцця адпаведных мераў.

Надзея ДРЫЛА.

«Страхавых выплат не было, паколькі ўжо паўгода, як быў скасаваны дагавор»

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

НЕ першы год запар жыхарка адной з вёсак Жыткавіцкага раёна страхуе здароўе ўсіх членаў сваёй сям'і, а таксама нерухомую маёмасць. Прычым, як па абавязковым страхаванні, так і па добраахвотным. Кажа, што аддала на гэтыя мэты шмат грошай, а вось калі ў сям'і здарылася няшчасце, атрымаць страхавыя выплаты не здолела.

— Летась, 30 кастрычніка, я аформіла страхоўку на сябе і дзіця. Паколькі страхавыя ўзносы можна ўносіць часткамі, напачатку ўнесла палову ад патрэбнай агульнай сумы, думаючы, што іх, у сваю чаргу, таксама падзеляць пароўну — на маю і сынаву страхоўкі. У пачатку кастрычніка гэтага года сын упаў і зламаў руку. 20 кастрычніка падала заяву на страхавыя выплаты, потым тэлефанавала страхаўшчыкам, цікавілася, калі можна атрымаць сродкі. Мяне запэўнілі, што хутка, праўда, суму не назвалі. Аднак выплат я не дачакалася, а 31 кастрычніка ўвогуле атрымала ліст з паведамленнем, што дагавор на страхаванне скасаваны, паколькі я не ўнесла другую частку грошай. А я ж іх перадавала страхавому агенту, але ён праз некалькі дзён вярнуў іх мне без тлумачэнняў, — распавяла пра сітуацыю жанчына.

Мы звярнуліся да выканаўцы абавязкаў дырэктара прадстаўніцтва Белдзяржстраха па Жыткавіцкім раёне Паўла ЦУКЕРА з просьбай праверыць выкладзеную заяўніцай інфармацыю. Праз дзень спецыяліст першай катэгорыі прадстаўніцтва Андрэй ХАРАСАХАЛ паведаміў нам наступнае.

— Сапраўды, ваша заяўніца 30 кастрычніка мінулага года заключыла дагавор добраахвотнага страхавання ад няшчасных выпадкаў — на сябе на суму ў адзін мільён рублёў і на большую суму на дзіця. Суму ўзносу, яна называецца страхавой прэміяй, цалкам і адразу ўнесла толькі за сябе. Чаму жанчына не сказала вам пра гэта? Яна ж на рукі атрымала поліс, дзе ўсё пазначана. На дзіця вырашыла ўносіць узносы паэтапна — за два разы. Першы ўнесла адразу. Другі, згодна з умовамі страхавання, трэба было ўнесці не пазней чым праз шэсць месяцаў пасля першага, у нашым выпадку — у красавіку, — распавёў Андрэй Юр'евіч. — Аднак гэтага не зрабіла, што і прывяло да аўтаматычнага скасавання дагавора. На адваротным баку страхавога поліса ёсць адпаведная інфармацыя пра такое правіла, дадаткова папярэджваць грамадзяніна ў падобнай сітуацыі мы не павінны. Таму, калі жанчына звярнулася па страхавыя выплаты з нагоды няшчаснага выпадку з сынам, ёй было адмоўлена, паколькі дагавор ужо паўгода не дзейнічаў. Чаму па тэлефоне ёй паабяцалі ў хуткім часе выплаты? Можна толькі меркаваць, што нехта з нашых спецыялістаў адказаў так увогуле — як пра сам працэс. Каб атрымаць выплаты, грамадзянін павінен напісаць адпаведную заяву, якая потым падпісваецца кіраўніцтвам, рэгіструецца і затым перадаецца для далейшай працы спецыялістам. І вось толькі на гэтай апошняй стадыі ўсё правяраецца, і толькі тады ёсць дакладная інфармацыя. У нашым выпадку — пра тое, што дагавор быў скасаваны раней.

Грошы ж, як сказаў далей Андрэй Харасахал, жанчына перадавала страхавому агенту з мэтай падаўжэння дагавора на дзіця на новы тэрмін. Аднак, даведаўшыся, што страхавых выплат не будзе, перадумала і забрала грошы...

Сяргей РАСОЛЬКА.

Побач з «Мінск-Арэнай» з'явілася алея спартыўнай славы

АЛЕЯ спартыўнай славы з'явілася ў беларускай сталіцы. Яе будаўніцтва днямі завершана побач з самым маштабным спартыўным збудаваннем сталіцы «Мінск-Арэнай». Галоўным элементам алеі стала 25-метровая стэла «Трыумф». Побач знаходзіцца пяць фантанаў, якія сімвалізуюць пяць алімпійскіх кольцаў. Па перыметры алеі ў выглядзе спартыўных медалёў размешчаныя медальёны з імёнамі ўсіх алімпійскіх чэмпіёнаў нашай краіны.

Ідэя размясціць алею спартыўнай славы побач з «Мінск-Арэнай» належыць кіраўніку дзяржавы і Прэзідэнцкаму спартыўнаму клубу, паведаміў **намеснік міністра архітэктуры і будаўніцтва Анатоль НІЧКАСАЎ,** які з'яўляецца кіраўніком праекта. «Гэта правільна, бо менавіта тут мы можам убачыць як сам спорт на пляцоўках Мінск-Арэны, так і далучыцца да яго гісторыі». Ён расказаў, што дамінанта архітэктурнага комплексу (ёй з'яўляецца стэла) выканана з бронзы. Вяршыня стэлы ўяўляе алімпійскі факел у выглядзе трох атлетаў. Сімволіку гэтага растлумачыў Анатоль Нічкасаў: «Мінск-Арэна» складаецца з некалькіх буйных элементаў — хакейнай арэны, веладрома і канькабежнага стадыёна. Яны размешчаныя такім чынам, што раскрываюць тры напрамкі ўспрыняцця — з цэнтра горада, з боку ўезду ў сталіцу і з боку пешаходных зонаў каля ўніверсітэта фізвыхавання і спорту. На кожны з гэтых напрамкаў зарыентаваныя і скульптуры атлетаў».

Фота БЕЛТА.

Скульптурныя работы элементаў алеі выконваў вядомы мастак Сяргей Бандарэнка і яго калегі. Распрацоўкай праекта займаўся «Белдзяржпраект», стэла зроблена на заводзе Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва ў Маладзечне, а будаўнічыя работы выконваў генеральны падрадчык «Мінскпрамбуд», які ўзводзіць «Мінск-Арэну». Дарэчы, асноўныя будаўнічыя работы на «Мінск-Арэне» былі завершаныя 7 лістапада. У канцы снежня будзе адчынена апошняя частка комплексу — хакейная пляцоўка.

Алена АЎЧЫННІКАВА.

ЗВЯЗДА 12 лістапада 2009 г.

ШТО ТАКОЕ КРЫЗІС І ЯК З ІМ ЗМАГАЦЦА

РЭПАРТАЖ З ЛАГОЙСКАГА РАЁННАГА СПАЖЫВЕЦКАГА ТАВАРЫСТВА

Прыгожы, маляўнічы куток месціцца ў цэнтры Лагойска, на шляху ад аўтавакзала і гарадской плошчы па яго цэнтральнай вуліцы. Дарога, якая да гэтага ідзе праз горад прама, раптам робіць рэзкі паварот і крута спускаецца ўніз, да невялікай рачулкі і прыгожага мастка цераз яе, з пажоўклымі вербамі на яе берагах, з жывой крыніцай на адным з іх і мясцовай знакамітай нават за межамі Беларусі купеллю. Кажуць, вада гэтай купелі, калі акунуцца ў яе, усе хваробы здымае; і нездарма тут заўсёды чарга да яе, а на Хрышчэнне для таго, каб зведаць усе лекавыя якасці гэтай жывой вады (ледзяной), людзі займаюць чаргу ажно з ночы і стаяць у ёй па некалькі гадзін... Побач, на пагорках, велічна ўзняліся ў неба два храмы — праваслаўны і каталіцкі. А яшчэ на адным з гэтых пагоркаў раскінуўся, зззяючы металам і шклом, здзіўляючы гасцей горада сваімі сучаснымі цікавымі архітэктурнымі формамі «Лагойскі пасаж». Яшчэ год таму тут месціўся гарадскі рынак з груба збітымі гандлёвымі сталамі і лаўкамі, які не надта ўпрыгожваў цэнтр горада. Але на пачатку гэтага года прыйшлі сюды мясцовыя будаўнікі — з ПМК-198 і стварылі ўжо зазначаны архітэктурны цуд, які сваімі філіграннымі формамі, падпорнымі каменнымі сценамі на розных узроўнях, іншымі нечаканымі архітэктурнымі знаходкамі не можа не прыцягнуць да сябе ўвагу. «Іншага такога гандлёвага пасажа не ва ўсякім буйным горадзе ўбачыш», — зазначаюць у Лагойскім райспажыўтаварыстве, у распараджэнні якога пасаж і знаходзіцца. Безумоўна, тут пры гэтым у першую чаргу маюць на ўвазе аб'ёмістыя гандлёвыя плошчы гэтага аб'екта ды іх надзвычайную насычанасць розным таварам. Але ж яўна не адкінеш і яго знешнюю прыгажосць, з якой ці паспаборнічае нават сталічны Аляксандраўскі пасаж, што размясціўся праз праспект ад Маскоўскага аўтавакзала.

— Некалькі месяцаў перад тым, як прыняць канчатковае рашэнне — узводзіць гэты аб'ект ці не, усё сумнявалася, — кажа старшыня праўлення Лагойскага райспажыўтаварыства **Ірына ПАРАХНЕВІЧ**. — Зразумела, на яго ўзвядзенне патрэбны былі немалыя грошы. А мы, тым болей, толькі крыху больш як год таму ўніверсам «Замкавы» ўзвялі — таксама сучасны гандлёвы аб'ект з гандлёвай плошчай 440 квадратных метраў. Потым усё ж рашыліся — будаваць. Для пачатку будаўніцтва была выдадзена мясцовая бюджэтная пазыка на суму 1,5 мільярда рублёў. Узялі тры мільярды рублёў крэдыту ў банку, мільярд выдзелілі нам з інвестыцыйнага фонду Белкаапсаюза, астатняе — нашы ўласныя сродкі. Будаўнікі, дзякуй ім, зрабілі сваю справу хутка і добра. Свой гандлёвы пасаж увялі мы ў ліпені, штомесяц маем ад яго (у прыватнасці ад комплексу па гандлі харчовымі таварамі плошчай 1000 квадратных метраў, які займае пераважную частку ў пасажы) ад 760 да 940 мільёнаў рублёў гандлёвага абароту; штодзень наведвае гэты комплекс больш як тысяча чалавек. Каб задзейнічаць гэты комплекс як мага больш эфектыўна, мець з яго яшчэ большы гандлёвы абарот, прапануем і пашыраем шэраг паслуг для пакупнікоў, кожны месяц уводзім нешта новае. Напрыклад, смажым піцу для іх прама на іх вачах, наладзілі ў кафетэрыі продаж марожанага на вагу, хутка пачнём рабіць кактэйлі. А яшчэ арганізавалі дзіцячы куток, прычым летам бацькі маглі ўзяць для сваіх дзяцей машынкі, на якіх тыя каталіся па шырокай пандусавай дарожцы, што ідзе ўздоўж пасажа. Наладзілі таксама продаж кветак, пры гэтым папярэдне падвучылі сваіх прадаўшчыц на спецыяльных курсах сакрэтам фларыстыкі... Асартымент тавараў — надзвычай шырокі, не ва ўсякім універсаме Мінска такі сустрэнеш — 21 500 найменняў ад 350 пастаўшчыкоў. Прадастаўляем сваім пастаўшчыкам (бясплатна!) месцы для ўсталявання рэкламных шчытоў, для правядзення розных гандлёвых акцый — калі ласка, прапагандуйце свой тавар, зніжайце (калі з'явілася такая добрая задумка) цэны, прадавайце. Выгада для вас — выгада і для нас, для нашага гандлёвага абароту... З уводам гэтага аб'екта мы сталі мець не толькі новы ўзровень гандлю, але і новы ўзровень адносінаў паміж гандлем і вытворцамі тавараў...

Напрошвалася пытанне да Ірыны Міхайлаўны: ці апраўдае сябе гэты гандлёвы аб'ект? Лагойск жа не такі ўжо і вялікі, 11 тысяч жыхароў налічвае, ды і іншыя гандлёвыя аб'екты ў ім ёсць...

Ірына Міхайлаўна пералічвае дадатковыя рэзервы: а мінчане (і не толькі яны), якія прыязджаюць па «жывую» ваду (пра лагойскую купель ведаюць нават у расійскім Оптына-Пустынскім манастыры), а Сілічы побач... Дарэчы, з улікам гэтых дадатковых рэзерваў у лагойскім пасажы адчынілі і пункт па абмене валюты.

Як зазначана ўжо, у лагойскім пасажы наладжаны гандаль пераважна харчовымі таварамі, разам з тым тут працуе «Будмаркет» (300 квадратных метраў), другі паверх гэтага аб'екта занялі індывідуальныя прадпрымальнікі, якія ў выніку «дапамагаюць» райспажыўтаварыству разлічвацца па крэдытах. Не забыліся і пра тых, хто раней гандляваў на гэтым месцы прадукцыяй са сваіх падворкаў — для іх на тэрыторыі, прылеглай да пасажа, пакінулі некалькі прывычных для іх тых жа драўляных сталоў.

* * *

Якія задачы ставяцца сёння перад сістэмай спажывецкай кааперацыі і, адпаведна, перад арганізацыямі спажывецкіх таварыстваў? Нагадаем: на час свайго нараджэння яны служылі ў якасці гэткага злучальнага звяна паміж горадам і вёскай, забяспечвалі свайго роду абмен прамысловымі таварамі і сельскагаспадарчай прадукцыяй, займаліся нарыхтоўкамі з індывідуальных вясковых падворкаў, а таксама арганізацыяй у вёсцы сістэмы гандлю. Па сутнасці, амаль што не змяніліся гэтыя задачы і функцыі і цяпер, больш за тое, калі мець на ўвазе яўнае распаўсюджванне сферы ўплыву спажывецкіх таварыстваў (напрыклад, на прыдарожны сэрвіс) — гэтыя задачы і функцыі нават пашырыліся. Хіба што ўсё гэта мае цяпер дакладна выразную эканамічную скіраванасць: спажывецкія таварыствы ў першую чаргу выступаюць як суб'екты гаспадарання і, адпаведна, іх найпершай мэтай з'яўляецца не толькі задавальненне насельніцтва ў таварах і паслугах, але і атрыманне прыбытку, забеспячэнне прыбытковай дзейнасці.

Якія кірункі займаюць асноўнае месца ў гаспадарчай дзейнасці Лагойскага раённага спажывецкага таварыства? Асноўнае месца з гэтых кірункаў займае гандаль. Прычым тут дасягнулі адных з найлепшых у сістэме спажывецкай кааперацыі краіны паказчыкаў па рэалізацыі тавараў (з разліку на аднаго жыхара на тэрыторыі, якая абслугоўваецца таварыствам): у Лагойску за месяц на аднаго жыхара раёна маюць гандлёвы абарот на суму каля 170 тысяч рублёў, у той час, як, напрыклад, па Мінскай вобласці гэты паказчык складае каля 70 тысяч рублёў. Таварыства мае ў сябе 330 квадратных метраў гандлёвых плошчаў з разліку на тысячу жыхароў пры сацыяльным стандарце 260 метраў. Менавіта забяспечанасць сучаснымі гандлёвымі плошчамі і стаяць у таварыстве на першае месца ў барацьбе за пакупніка. «Каб прапанаваць пакупніку найбольшы асартымент тавараў, што выпускаюцца прамысловасцю, даць яму комплекс дадатковых, спадарожных гандлёвых паслуг, трэба мець менавіта сучасныя гандлёвыя прадпрыемствы з вялікімі гандлёвымі плошчамі, з найноўшым гандлёвым абсталяваннем», — падкрэслівае старшыня Лагойскага таварыства Ірына Парахневіч.

Ужо гаварылася пра яго новы гандлёвы комплекс «Лагойскі пасаж», варта дадаць: як падлічыла кіраўнік харчовай залы пасажа Ірына Рашкевіч, толькі мяса-каўбасных вырабаў тут прапануецца больш як 200 відаў, прычым і геаграфія вытворцаў самая шырокая — ад Барысаўскага мясакамбіната да брэсцкага «Інка-фуда».

Ганарацца ў таварыстве і сваім іншым гандлёвым аб'ектам, які ўведзены ў Лагойску таксама адносна нядаўна — летам мінулага года. Гэта — універсам «Замкавы» (з вежай, з вялікім гадзіннікам на гэтай вежы, што сваім боем рэгулярна паведамляе пра хуткацечнасць нашага часу), які таксама вельмі папулярны ў лагайчан і гасцей горада і на долю якога таксама прыпадае важкая доля гандлёвага абароту. Прычым, варта адзначыць, і тут, як і ў тым жа «Пасажы», змаглі прапанаваць пакупніку нешта «незвычайнае»: уласную кандытарскую выпечку, наладжаную згодна з папулярнай нямецкай рэцэптурай. Як расказала тэхнолаг кандытарскага цэха ўніверсама Ірына Яцкевіч, тут прапануюць сваёй прадукцыі (пірагоў, тартоў і іншай; з вяршкамі, з садавіной і г.д.) — за месяц тры тоны, на суму 26—27 мільёнаў рублёў; попыт на яе — пастаянна высокі.

Вядома, для таварыства, у зону абслугоўвання якога ўваходзяць усе населеныя пункты раёна, было б вельмі вузкай задачай мець узорнае гандлёвае абслугоўванне, што датычылася б толькі непасрэдна жыхароў райцэнтра, важна наладзіць такое абслугоўванне для ўсіх. А, дарэчы, уваходзяць у гэту зону больш за 300 населеных пунктаў. Падыход пры гандлёвым абслугоўванні жыхароў вёскі ў таварыства наступны: мець стацыянарны гандаль, г.зн. непасрэдна крамы, у тых вёсках, у якіх жыве не менш за 50 жыхароў.

Асаблівая ўвага, вядома ж, — аграгарадкам, у якіх, як падкрэсліваюць у таварыстве, гандлёвыя аб'екты, што ўзводзяцца, ніколькі не саступаюць гарадскім. У большасці аграгарадкоў такія аб'екты ўжо працуюць, шэраг іх яшчэ будзе ўзведзены. Дарэчы, за 4 гады ў 8 аграгарадках пабудаваныя 5 новых крамаў.

Стацыянарны гандаль — вядома, больш зручны для жыхароў вёскі, ды толькі не паўсюдна выпадае яго наладзіць. Зразумела, гэта датычыцца зусім невялікіх вёсак. У такія вёскі таварыства накіроўвае свае аўтакрамы, прычым тыя аўтакрамы, якія таварыства набыло апошнім часам, абсталяваны адной маразільнай і дзвюма халадзільнымі ўстаноўкамі. Зразумела, гэта дазваляе і ў вёску даставіць якасны і больш разнастайны харчовы асартымент. Абазначым тут жа адну праблему, якую назвалі ў таварыстве. Калі гандлёвае абслугоўванне вёскі ўваходзіць у непасрэдны абавязак таварыства, і яно імкнецца зрабіць гэта як мага лепш, імкнецца да таго, каб і цэны на тавар, што дастаўлены аўтатранспартам, не зашкальвалі (усё ж такі дадаюцца на такі тавар і транспартныя выдаткі), то апошнім часам рушылі са сваім тавараў у вёску і прыватныя аўтакрамы. Вядома, з тым, каб зарабіць. Ну, а калі на ўвазе менавіта толькі гэта мэта, чакаць належнага гандлёвага абслугоўвання нельга. А ўсе агрэхі такога абслугоўвання, вядома, спісваюцца потым на райспажыўтаварыства. І зразумела чаму: вясковы пакупнік не будзе ўдакладняць, чыя аўтакрама да яго прыехала, а вось пра тое, хто адказвае за гандаль у вёсцы, ён ведае добра. «Напэўна, не пашкодзіла б прадстаўнікам кантрольных органаў часам запытацца ў такіх вось вандроўных гандляроў: «А чые вы будзеце, як гандлюеце і ці захоўваеце ўсе неабходныя правілы гандлю, усе неабходныя санітарна-гігіенічныя нормы, і, увогуле, ці ёсць у вас ліцэнзія?» — так ставяць пытанне ў Лагойскім райспажыўтаварыстве. І, безумоўна, вельмі правільна ставяць.

А віном для вас слаба займацца?

Разам з іншымі пытаннямі і такое было зададзена Ірыне Міхайлаўне. Аднак перш чым перайсці да нашага віннага дыялогу (ці дакладней — маналогу Ірыны Міхайлаўны), зазначым: у сферу асноўных відаў дзейнасці Лагойскага райспажыўтаварыства ўваходзяць таксама, акрамя гандлю, перапрацоўка асобных відаў прадукцыі і сыравіны, а яшчэ нарыхтоўка гародніны, садавіны, дзікарослых ягадаў, грыбоў і г.д., ды яшчэ аказанне насельніцтву пэўных паслуг. Такім чынам, перапрацоўка. Па сутнасці, калі не ўлічваць таго, што ў таварыстве яшчэ квасяць капусту, соляць агуркі (прычым соляць, не здраджваючы старым, праверaным рэцэптам, г.зн. соляць у бочках, а не ў традыцыйных цяпер трохлітровых слоіках. Адпаведна, і агурочкі — сапраўдныя, хрусткія і апетытныя), тут практычна займаюцца толькі мясаперапрацоўкай — выпускаюць (для свайго ж гандлю) шашлыкі, біфштэксы і г.д., а таксама некаторыя віды вяндліны, у тым ліку і каўбасы. Жывёлу купляюць як у насельніцтва, так і ў калгасаў, прыкладна папалам. Быў некалі ў таварыства і свой хлебазаводзік, ды зразумелі ў ім, што трымаць гэты заводзік пад бокам у буйных сталічных хлебакамбінатаў зусім не рэнтабельна, ды і немэтазгодна. Ды і ўвогуле, як вельмі правільна лічаць у таварыстве, нельга спажыўкааперацыі, як і раней, займацца амаль усімі відамі дзейнасці. Словам, баль павінна правіць у першую чаргу эканоміка, г. зн. амаль любы від дзейнасці (за рэдкім выключэннем, або ў тых выпадках, калі задаволіць пэўныя патрэбы жыхароў раёна, акрамя райспажыўтаварыства, больш няма каму) павінен быць эканамічна абгрунтаваным...

Аднак вернемся да вышэйабазначанага пытання да Ірыны Міхайлаўны. Адразу ж адзначым: выклікала яно ў яе даволі буйны пратэст:

— А іх, гэтых вінзаводаў, столькі, што ад іх і так нудзіць. Ды яшчэ такая барацьба за збыт Дасылаюць да нас (вядома, па нашай заяўцы) 100—200 скрыняў гарэлкі, але не проста так, а строга па папярэдняй аплаце. А следам шлюць яшчэ 400 скрыняў віна. І ўжо без усялякай папярэдняй аплаты, праўда, на працягу месяца ўсё роўна павінны заплаціць. Ну, а дзе вашы разнастайныя бальзамы, паважаныя працаўнікі «Крышталя»? У прыгожых, сувенірных бутэльках...

Я разумею, на віно лягчэй зрабіць большую цану, адсюль і гэты нізкапробны вінны вал. Ды і гандлю добра: калі сярэдняя нацэнка на тавары (напрыклад, у нас) складае 17,5—18 працэнтаў, то на тое ж віно — 30. І гандляваць лягчэй...

Адно радуе ў гэтай сітуацыі: людзі сталі неяк менш заўважаць гэты нізкаякасны вінны прадукт, ва ўсякім разе такая тэндэнцыя назіраецца ў гандлёвых пунктах нашага таварыства. Так, сёлета мы маем 80 працэнтаў яго рэалізацыі адносна мінулага года, а ў мінулым годзе мелі 85 працэнтаў у адносінах да папярэдняга...

— Ірына Міхайлаўна, вас закранутае пытанне гэтак хвалюе як парламентарыя (удакладнім: яна з'яўляецца членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу краіны)?

— Хвалюе і як парламентарыя, і як проста чалавека, як грамадзянку нашай краіны.

* * *

Знакамітая мінская «Камароўка» ўсё ж часам перагінае са сваімі цэнамі. Адным словам, калі вам патрэбныя журавіны (не кілаграм і не два, а, скажам, вядро), дык, можа, лепей з'ездзіць у Лагойск (недалёка ж), у яго «Пасаж» ці «Замкавы»? На Камароўцы 6 тысяч каштуе кілаграм, а ў Лагойску — 4400. Словам, вось вам і больш танны рынак...

— А мы і не імкнёмся «нажыцца» менавіта за кошт цаны. Хоць, вядома ж, хочам крыху разбагацець; яшчэ шмат чаго трэба рэканструяваць, зрабіць. Напрыклад, хацелася б мець сучасныя камеры ў сваім сховішчы для агародніны з дакладным тэмпературна-вільготным рэжымам у іх. А каб адпаведным чынам абставіць толькі адну такую камеру, патрэбна 200 мільёнаў рублёў, а ў нас такіх камераў некалькі...

Ужо адзначалася, у Лагойскім райспажыўтаварыстве займаюцца таксама нарыхтоўкамі. Тых жа журавінаў, на якія, дарэчы, не такія ўжо і багатыя лагойскія мясціны (ездзілі нарыхтоўваць у Чэрвень, Беразіно, Бягомль) нарыхтавалі 20 тон, брусніцаў — 3 тоны, грыбоў — 3,6 тоны, а чарніцаў — ажно 91 тону. Пры гэтым 80 тон чарніцаў адправілі на экспарт, зарабілі на гэтым 32 мільёны рублёў прыбытку. «Цана на чарніцы сёлета была ў 2 разы ніжэйшая, чым летась, тым не менеш, атрымалі не меншы даход — за кошт большага аб'ёму нарыхтоўкі і экспарту. Так, летась нарыхтавалі 38 тон, на экспарт адправілі 20 тон. Капейка да капейкі — і нешта ёсць. І насельніцтву такім чынам даём зарабіць», — так каментуюць сваю нарыхтоўчую дзейнасць у Лагойскім таварыстве. У ім пры гэтым ёсць (у Плешчаніцах) камера хуткага замарожвання на 20 тон, што дае магчымасць даставіць лагойскі лясны далікатэс у поўнай захаванасці, без страты ім усіх сваіх лясных водараў і вітамінных якасцяў. Добра разыходзіцца і іншая лясная прадукцыя, у тым ліку і грыбы, якія з задавальненнем бяруць рэстараны комплексаў «Трайпл» і «Лайгоскі», што размешчаны побач, мінскія рэстараны. Што ж, грыбы, сабраныя ў лагойскіх мясцінах, не патрабуюць асобнай рэкламы — выдатны, экалагічна чысты лясны прадукт.

У Лагойскім райспажыўтаварыстве запэўніваюць жыхароў свайго раёна: будуць яны забяспечаныя на ўсю доўгую зіму (а практычна да новага ўраджаю) і бульбай, буракамі, морквай, цыбуляй, капустай, якіх заклалі на захоўванне пад поўную патрэбнасць свайго гандлю, а таксама пад патрэбнасці сталовых школ, бальніц, іншых аб'ектаў грамадскага харчавання. Нават ёсць што прадаць іншым. Дарэчы, уся гэта прадукцыя прайшла строгую праверку на нітраты, пестыцыды і іншыя магчымыя адхіленні ад нормы.

* * *

Аднак якія прыгожыя на Лагойшчыне краявіды, нездарма называюць яе беларускай Швейцарыяй. І калі дзе і развіваць прыдарожны сэрвіс, то, несумненна, і тут таксама. Пра гэта і сказалі мы Ірыне Міхайлаўне Парахневіч.

— А ў нас ужо ёсць некалькі месцаў, якія прыцягваюць амаль тараў павандраваць ды і іншых падарожнікаў, — адказала яна. А пры гэтым прапанавала з'ездзіць у знакамітыя гасцінічна-рэстаранны комплекс «Партызанскі Бор», які размясціўся на віцебскай трасе перад паваротам на Хатынь. Але не для таго, каб пабачыць сам гэты комплекс (ды хто ж яго не ведае), а каб паглядзець новабудоўлю побач з ім. А тут, за агароджай, ужо ўзведзены лазня з басейнам, прасторная альтанка; падыходзіць да завяршэння будаўніцтва гасцявога дамка, разлічанага для адпачынку некалькіх сем'яў. Тут жа будуць разбіты кветнікі, шашлычны ачаг і іншыя рэчы. Адным словам, адпачывай — не хачу.

— Па сутнасці, мы толькі пачынаем асвойваць прыдарожны бізнэс, але, думаю, ужо хутка задзейнічаем яго на поўную сілу; няхай і ён прыносіць сваю долю даходу, — казала Ірына Міхайлаўна.

Нельга тут не дапоўніць яе: для тых, хто вырашыў заняцца прыдарожным сэрвісам і агратурызмам, дзяржава прадугледжвае (і гэта, як правіла, датычыць навастворaных суб'ектаў), пэўныя льготы. А вось што датычыцца тых жа райспажыўтаварыстваў, якія займаюцца менавіта такім жа бізнэсам, ніякіх ільготаў няма. Яўна нелагічна атрымліваецца, справу ж як тыя, так і другія адну робяць. Чаму ж тады яна па-рознаму ацэньваецца? Дарэчы, гэта пытанне і да самой Ірыны Міхайлаўны. Як да парламентарыя...

* * *

Сёлета, расказвае Ірына Міхайлаўна, наведаў іх Прэзідэнт краіны, пытаецца: ёсць у вас крызіс ці няма?

А яна, як яна цяпер сама прызнаецца, і не ведала, што адказаць. Не ведае і цяпер. Усе навокал толькі і гавораць пра гэты самы крызіс, а да іх райспажыўтаварыства ён як быццам і не дацягнуўся. Ну пра які крызіс тут можна гаварыць, калі ў мінулым годзе месячны гандлёвы абарот таварыства складаў 5,5 мільярда рублёў, сёлета — 6,5. Больш за 160 тысяч долараў зарабілі на экспарце, а летась было каля 84 тысяч. Заданне па нарыхтоўках ад насельніцтва выканалі на 116 працэнтаў, па платных паслугах на 103, па тым жа гандлёвым абароце — на 103. У мінулым годзе за 9 месяцаў зарабілі чыстага прыбытку 268 мільёнаў рублёў, сёлета — 283, а ў наступным годзе ўвогуле мяркуюць выйсці на мільярд. 45 новых працоўных месцаў арганізавалі. Няхай не ўсе прагнозныя паказчыкі выконваюцца, але ж ёсць добрая, станоўчая дынаміка, ёсць рух наперад.

Аднак што наконт крызісу? Крызіс, упэўненая Ірына Міхайлаўна, нашаранецца ў душах людзей, яму папярэднічае свайго роду дэпрэсія.

— А ў нас ніякай дэпрэсіі няма. Ёсць добры настрой, які не адолее ніякая дэпрэсія. І гэта — галоўнае.

Іван БАРАНОЎСКІ.

На здымках:

1. Крама «Над возерам» у в. Калары. Загадчыца крамы Ніна ЛУЦКАЯ кажа: «У нас ёсць усё».

2. Старшыня Лагойскага райспажыўтаварыства Ірына ПАРАХНЕВІЧ.

3. «Лагойскі пасаж».

4. У гандлёвай зале пасажа: перад адкрыццём.

5. Прадавец «Лагойскага пасажа» Таццяна ВЯРБІЦКАЯ спрытна выпякае смачныя піцы.

6. Хрысціна МІХНАВЕЦ запрашае пакаштаваць «жывога» піва.

7. Універсам «Замкавы».

8. Загадчыца сховішча для агародніны Ірына УСЦІН задаволеная якасцю і смакам салёных гурочкаў.

9. Прыгожыя і смачныя пірагі атрымліваюцца ў кандытараў універсама «Замкавы» Наталлі РАТКЕВІЧ, Святланы ПРАЧКОЎСКАЙ, Валянціны КРАСУЦКАЙ.

10. Дырэктар комплексу «Партызанскі Бор» Андрэй ФЕДАРОВІЧ запрашае і гарантуе добры адпачынак.

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

УНП 600381366

З РУХУ ЗДЫМАЮЦЦА ЭЛЕКТРАЦЯГНІКІ

Як паведамілі «Звяздзе» ў Мінскім аддзяленні Беларускай чыгункі, з 13 лістапада здымаецца шэраг электрычак.

У прыватнасці, НА ЎЧАСТКУ МІНСК — МАЛАДЗЕЧНА: ПА СУБОТАХ І НЯДЗЕЛЯХ — электрычкі Мінск — Аляхновічы адпраўленнем са станцыі Мінск-Пасажырскі ў 7.20, 8.06, 8.46, 10.24, 16.10; электрацягнікі Аляхновічы — Мінск адпраўленнем са станцыі Аляхновічы ў 9.01, 9.54, 10.15, 12.10, 18.04; ПА СУБОТАХ — Мінск — Аляхновічы адпраўленнем са станцыі Мінск-Пасажырскі ў 9.43, 11.48; Аляхновічы — Мінск адпраўленнем са станцыі Аляхновічы ў 11.36, 14.10; ПА НЯДЗЕЛЯХ — Мінск — Аляхновічы адпраўленнем са станцыі Мінск-Пасажырскі ў 14.03; Аляхновічы — Мінск адпраўленнем са станцыі Аляхновічы ў 15.27; ПА ПЯТНІЦАХ І НЯДЗЕЛЯХ — Мінск — Уша адпраўленнем са станцыі Мінск-Пасажырскі ў 15.05; Уша — Мінск адпраўленнем са станцыі Уша ў 16.45; Мінск — Аляхновічы адпраўленнем са станцыі Мінск-Пасажырскі ў 18.58; Аляхновічы — Мінск адпраўленнем са станцыі Аляхновічы ў 20.55; ПА ПЯТНІЦАХ, СУБОТАХ І НЯДЗЕЛЯХ — Мінск — Аляхновічы адпраўленнем са станцыі Мінск-Пасажырскі ў 15.50; Аляхновічы — Мінск адпраўленнем са станцыі Аляхновічы ў 17.17.

НА ЎЧАСТКУ МІНСК — АСІПОВІЧЫ: ПА СУБОТАХ — здымаецца электрацягнік Мінск — Пухавічы адпраўленнем са станцыі Мінск-Пасажырскі ў 7.13; Пухавічы — Мінск адпраўленнем са станцыі Пухавічы ў 8.47; ПА СУБОТАХ І НЯДЗЕЛЯХ — Мінск — Пухавічы адпраўленнем са станцыі Мінск-Пасажырскі ў 8.17, 9.06, 12.52; Пухавічы — Мінск адпраўленнем са станцыі Пухавічы ў 10.47, 12.06, 15.51; ПА ПЯТНІЦАХ І СУБОТАХ — Мінск — Пухавічы адпраўленнем са станцыі Мінск-Пасажырскі ў 17.06; Пухавічы — Мінск адпраўленнем са станцыі Пухавічы ў 18.46; ПА НЯДЗЕЛЯХ — электрычка Мінск — Пухавічы адпраўленнем са станцыі Мінск-Пасажырскі ў 18.18; Пухавічы — Мінск адпраўленнем са станцыі Пухавічы ў 20.08.

НА ЎЧАСТКУ МІНСК — БАРАНАВІЧЫ: ПА СУБОТАХ І НЯДЗЕЛЯХ — здымаецца электрацягнік Мінск — Стоўбцы адпраўленнем у 9.21 (Інстытут культуры), 11.15 (Інстытут культуры), 12.45 (Мінск-Пасажырскі); Стоўбцы — Мінск, Інстытут культуры адпраўленнем са станцыі Стоўбцы ў 12.16, 13.36, 16.00; ПА СУБОТАХ — Мінск, Інстытут культуры — Стоўбцы адпраўленнем у 10.16 (Інстытут культуры); Стоўбцы — Мінск, Інстытут культуры са станцыі Стоўбцы ў 12.56 (Інстытут культуры); ПА ПЯТНІЦАХ І НЯДЗЕЛЯХ — Мінск, Інстытут культуры — Стоўбцы адпраўленнем у 16.06 (Інстытут культуры); Стоўбцы — Мінск, Інстытут культуры адпраўленнем у 18.32 (Інстытут культуры).

НА ЎЧАСТКУ МІНСК — ОРША: ПА СУБОТАХ І НЯДЗЕЛЯХ — Мінск — Барысаў адпраўленнем у 9.57 (Інстытут культуры), 10.39 (Мінск-Усходні), 14.00 (Інстытут культуры); Барысаў — Мінск адпраўленнем са станцыі Барысаў у 12.10 (Інстытут культуры), 12.46 (Мінск-Усходні), 17.47 (Мінск-Усходні).

НА ЎЧАСТКУ ОРША — ЛЕПЕЛЬ: ПА СУБОТАХ І НЯДЗЕЛЯХ — здымаецца цягнік Орша — Чашнікі адпраўленнем са станцыі Орша ў 7.18; Чашнікі — Орша адпраўленнем са станцыі Чашнікі ў 9.55; ПА СУБОТАХ — Орша — Лепель адпраўленнем са станцыі Орша ў 13.35; Лепель — Орша адпраўленнем са станцыі Лепель у 17.44.

Сяргей РАСОЛЬКА.

БУДУЦЬ ДАДАТКОВЫЯ ЦЯГНІКІ. У ТЫМ ЛІКУ І НА СВЯТЫ

Яны прызначаюцца з 13 лістапада і да адмены па пятніцах і нядзелях.

У прыватнасці, гэта цягнікі: 603 Гомель — Мінск адпраўленнем з Гомеля па пятніцах і нядзелях у 17.05 і прыбыццём у Мінск па пятніцах і нядзелях у 22.06; 604 Мінск — Гомель адпраўленнем з Мінска па пятніцах і нядзелях у 23.59 і прыбыццём у Гомель па суботах і панядзелках у 5.16.

Таксама, паводле інфармацыі Мінскага аддзялення Беларускай чыгункі, у раскладзе з'явяцца наступныя дадатковыя цягнікі напярэдадні і падчас калядных і навагодніх святаў: 558 Мінск — Санкт-Пецярбург адпраўленнем з Мінска 30 снежня ў 0.55 і прыбыццём у Санкт-Пецярбург 30 снежня ў 17.34; 557 Санкт-Пецярбург — Мінск адпраўленнем з Санкт-Пецярбурга 30 снежня ў 22.29 і прыбыццём у Мінск 31 снежня ў 12.19; 551 Масква — Брэст адпраўленнем з Масквы 26 снежня, 2 і 3 студзеня ў 0.39 і прыбыццём у Мінск у 10.24, адпраўленнем у 10.38, прыбыццём у Брэст 26 снежня, 2 і 3 студзеня ў 15.23; 537 Масква — Брэст адпраўленнем з Масквы 26 і 29 снежня, 3 студзеня ў 14.07, прыбыццём у Мінск у 0.31, адпраўленнем у 0.45, прыбыццём у Брэст 27 і 30 снежня, 4 студзеня ў 4.50; 552 Брэст — Масква адпраўленнем з Брэста 26, 27 і 30 снежня, 2, 3 і 4 студзеня ў 19.02, прыбыццём у Мінск у 23.59, адпраўленнем у 0.19, прыбыццём у Маскву 27, 28 і 31 снежня, 3, 4 і 5 студзеня ў 12.33.

Сяргей РАСОЛЬКА.

24.11.2009 в 12.30 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «МИНСКЭНЕРГОСТРОЙ»

Повестка дня:
1. О совершении сделок Общества.

Собрание состоится по адресу: г. Минск, ул. Монтажников, 39.

Начало регистрации: 12.00.

УНП 100008291

ЕПІСКАПА САФРОНІЯ ПАРАНІЎ ПСІХІЧНА ХВОРЫ ЧАЛАВЕК

Справа перададзена ў суд, каб накіраваць злачынцу на прымусовае лячэнне.

«Звязда» паведамляла, што напрыканцы жніўня ў Магілёўскім саборы Трох Святіцеляў перад нядзельнай літургіяй 36-гадовы мужчына нанёс епіскапу Магілёўскаму і Мсціслаўскаму нажавыя раненні. Уладыку Сафронію тады зрабілі тэрміновую аперацыю, ён ачуняў. А мужчыну, які напаў на яго, затрымалі, і цяпер ён утрымліваецца пад вартай. Расследаванне гэтай крымінальнай справы завершана. Высветлілася, што нападнік — хворы чалавек, які пакутуе на параноідальную шызафрэнію. Судова-псіхіятрычная экспертыза вызначыла, што злачынства ён учыніў у бессвядомым стане. Суд вырашыць яго лёс: верагодней за ўсё, мужчына будзе ўтрымлівацца ў псіхіятрычнай бальніцы пад строгім наглядам.

Ілона ІВАНОВА.

ОАО «БЕЛСЕЛЬЭЛЕКТРОСЕТЬСТРОЙ»
сообщает о проведении 26 ноября 2009 года внеочередного общего собрания акционеров

Повестка дня:
1. О порядке ведения собрания.
2. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи.

Место проведения: г. Минск, ул. Сухая, 3.
Начало в 12 часов.
Начало регистрации в 9 часов.
Тел. для справок: (017) 226 77 39; 203 63 64; 226 66 47.

Для регистрации на собрании акционерам иметь при себе паспорт, представителям акционеров — паспорт и нотариально оформленную доверенность.

Наблюдательный совет ОАО «Белсельэлектросетьстрой».

УНП 100120777

ГОМЕЛЬСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ТЕРРИТОРИАЛЬНЫЙ ФОНД ГОСУДАРСТВЕННОГО ИМУЩЕСТВА

проводит 15 декабря 2009 г. аукцион по продаже объектов недвижимости государственной собственности

ЛОТ № 1
Гаражный бокс № 2, инв. № 320/С-14919.
Сведения о предмете аукциона: подземный одноэтажный гаражный бокс площадью 33,7 кв.м, стены кирпичные и бетонные, перекрытия – ж/бетонные плиты, год постройки – 1999.
Местонахождение: Гомельская обл., г. Жлобин, ул. Карла Маркса, 1-б.
Оценочная стоимость – 8 344 179 руб.
Начальная цена продажи – 6 675 344 руб. (снижена на 20 %). **Задаток – 650 000 руб.**

ЛОТ № 2
Гаражный бокс № 3, инв. № 320/С-14921.
Сведения о предмете аукциона: подземный одноэтажный гаражный бокс площадью 33,5 кв.м, стены кирпичные и бетонные, перекрытия – ж/бетонные плиты, год постройки – 1999.
Местонахождение: Гомельская обл., г. Жлобин, ул. Карла Маркса, 1-б.
Оценочная стоимость – 8 327 647 руб.
Начальная цена продажи – 6 662 118 руб. (снижена на 20 %). Задаток – **650 000 руб.**

ЛОТ № 3
Гаражный бокс № 4, инв. № 320/С-14922.
Сведения о предмете аукциона: подземный одноэтажный гаражный бокс площадью 33,8 кв.м, стены кирпичные и бетонные, перекрытия – ж/бетонные плиты, год постройки – 1999.
Местонахождение: Гомельская обл., г. Жлобин, ул. Карла Маркса, 1-б.
Оценочная стоимость – 8 354 795 руб.
Начальная цена продажи – 6 683 836 руб. (снижена на 20 %). **Задаток – 650 000 руб.**

ЛОТ № 4
Гаражный бокс № 15, инв. № 320/С-14924.
Сведения о предмете аукциона: подземный одноэтажный гаражный бокс площадью 33,6 кв.м, стены кирпичные и бетонные, перекрытия – ж/бетонные плиты, год постройки – 1999.
Местонахождение: Гомельская обл., г. Жлобин, ул. Карла Маркса, 1-б.
Оценочная стоимость – 8 337 934 руб.
Начальная цена продажи – 6 670 348 руб. (снижена на 20 %). **Задаток – 650 000 руб.**

ЛОТ № 5
Гаражный бокс № 16, инв. № 320/С-14923.
Сведения о предмете аукциона: подземный одноэтажный гаражный бокс площадью 33,6 кв.м, стены кирпичные и бетонные, перекрытия – ж/бетонные плиты, год постройки – 1997.
Местонахождение: Гомельская обл., г. Жлобин, ул. Карла Маркса, 1-б.
Оценочная стоимость – 8 230 279 руб.
Начальная цена продажи – 6 584 224 руб. (снижена на 20 %). Задаток – **650 000 руб.**

Продавец по всем лотам: республиканское унитарное предприятие «Белорусский металлургический завод», тел. в Жлобине (02334) 27 055.

Организатор аукциона – фонд «Гомельоблимущество», г. Гомель, проспект Ленина, 3, контактные телефоны: **(0232) 70 14 72, 74 90 27.**

Аукцион проводится **15 декабря 2009 г. в 11.30 по адресу: г. Гомель, проспект Ленина, 3.**

Торги проводятся в соответствии с Инструкцией о порядке организации и проведения торгов по продаже некоторых объектов республиканской собственности, утвержденной Постановлением Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь от 30 марта 2009 г. № 36.

Желающим участвовать в аукционе необходимо в срок до 17.00 11 декабря 2009 г. заключить с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон и представить организатору аукциона следующие документы: заявление на участие в аукционе по установленной форме; заверенную банком копию платежного поручения, подтверждающую внесение задатка на счет организатора аукциона, указанный в извещении; копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации; юридическим лицом – доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык; представителем иностранного юридического лица или иностранного гражданина, лица без гражданства – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык; представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе участники или их представители предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения торгов в любое время, но не позднее чем за три дня до даты его проведения.

Задаток перечисляется на расчетный счет фонда «Гомельоблимущество» **№ 3642927330048** в филиале **№ 300** ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Гомель, код **МФО 151501661**, **УНН 400243904.** Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гомель, проспект Ленина, 3, фонд «Гомельоблимущество», **ком. 406, с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00** по рабочим дням по **11 декабря 2009 г.** включительно.

Заключительная регистрация участников **15 декабря 2009 г. с 10.00 до 11.15.**

Победитель аукциона в течение 3 банковских дней со дня проведения торгов обязан возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона.

После совершения победителем аукциона названных платежей с ним продавцом заключается договор купли-продажи недвижимого имущества. Оплата за приобретенный объект осуществляется в течение 30 календарных дней после подписания договора купли-продажи.

Информация о продаваемых объектах расположена на сайте Гомельского облисполкома: www.gomel-region.by, и сайте Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь: www.gki.gov.by.

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ по продаже права аренды земельного участка Аукцион проводит КУП «Жлобинский центр управления районной коммунальной собственностью»

1	Дата, время и место проведения аукциона	**Аукцион состоится 15 декабря 2009 г., в 11.00, по адресу: г. Жлобин, ул. Петровского, 45**
2	Срок приема документов	с 9.00 до 17.00 по рабочим дням до 9 декабря 2009 года, 9 декабря 2009 года – до 15.00
3	Номер лота	1
4	Адрес земельного участка	г. Жлобин, микрорайон 18, д. 46
5	Кадастровый номер участка	321850100002002833
6	Площадь, га	0,5985 га
7	Целевое назначение	для строительства и обслуживания универсама
8	Срок аренды	25 лет
9	Характеристика территории и расположенных на участке инженерных коммуникаций, строений и сооружений; инженерно-геологические условия	Участок свободен от застройки (инженерно-геологические условия будут определены на стадии производства проектно-изыскательских работ)
10	Ограничения и условия	1. внесение победителем аукциона платы за право заключения договора аренды земельного участка; 2. возмещение победителем аукциона расходов, связанных с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания и изменения земельного участка; 3. заключение победителем с райисполкомом договора аренды земельного участка и осуществление в двухмесячный срок после принятия решения райисполкома о предоставлении ему земельного участка государственной регистрации права на земельный участок; 4. получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий 1 год; 5. осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией
11	Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории	Подключение к общегородским сетям и сооружениям инженерной инфраструктуры выполняется по техническим условиям эксплуатирующих организаций с учетом нагрузок, определенных при разработке ПСД
12	Начальная стоимость, рублей	130 433 238
13	Сумма задатка, рублей	10 000 000
14	Затраты по изготовлению землеустроительной документации, рублей	1 906 780
15	Стоимость расходов по организации и проведению аукциона (ориентировочно), рублей	2 000 000

1. Аукцион состоится при наличии не менее двух участников. Не допускается продажа по начальной цене. Победителем признается участник, предложивший наиболее высокую цену. В течение 10 рабочих дней местный исполнительный комитет принимает решение о предоставлении земельного участка в аренду. Победитель обязан внести плату за право аренды земельного участка, определенную в результате торгов, возместить расходы, связанные с подготовкой аукциона и документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона.

2. К участию допускаются

граждане и юридические лица, подавшие заявления в срок, указанный в извещении, подписавшие соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, представившие копию платежного поручения, заверенную банком, подтверждающую внесение задатка в размере, указанном в извещении;

юридические лица Республики Беларусь – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), нотариально удостоверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации;

индивидуальные предприниматели – заверенная копия свидетельства о государственной регистрации;

иностранные юридические лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык;

представители иностранного юридического лица или гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык;

представители гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность.

3. Перечисление суммы задатка и иные платежи осуществляются на расчетный счет № 3012006530026 в филиале № 312 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Жлобин, код МФО 151501673, УНН 490317354.

4. При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность. Представители гражданина – нотариально удостоверенную доверенность.

5. Оплата стоимости предмета аукциона, расчеты с организатором аукциона осуществляются в установленном порядке в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола аукциона. Сумма задатка победителя аукциона засчитывается при оплате им стоимости земельного участка.

Всем желающим представляется возможность предварительно ознакомиться с документами по объекту и с объектом в натуре. Контактные телефоны: **8 (02334) 9 11 21, 2 18 18, 3 14 08.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА по продаже объектов республиканской собственности и права заключения договоров аренды земельных участков для обслуживания продаваемого недвижимого имущества

Лот № 1 **Предмет аукциона, место нахождения имущества, информация о земельном участке**	**Капитальные строения:** инв. №№ 420/С-28418, 420/С-28419, 420/С-28420, расположенные по адресу: Гродненская обл., Лидский р-н, Дубровенский сельсовет, южнее г. Лиды, и право заключения договора аренды земельного участка с кадастровым номером 423684000013000007 площадью 1,3270 га, сроком на 50 лет
	Начальная цена предмета аукциона – 305 160 985 руб., **сумма задатка** – 30 516 000 руб.
	Продавец недвижимого имущества: Государственное учреждение «Барановичское эксплуатационное управление Вооруженных Сил»
Лот № 2 **Предмет аукциона, место нахождения имущества, информация о земельном участке**	**Капитальное строение** инв. № 450/С-1714, расположенное по адресу: Гродненская область, г. Слоним, ул. Гнидаша, д. 3, и право заключения договора аренды земельного участка с кадастровым номером 425450100001006857 площадью 0,1339 га сроком на 50 лет
	Начальная цена предмета аукциона – 244 298 896 руб., **сумма задатка** – 24 429 000 руб.
	Продавец недвижимого имущества: Департамент охраны Министерства внутренних дел Республики Беларусь
Организатор аукциона (наименование, адрес, тел.)	Гродненский областной территориальный Фонд государственного имущества (Фонд «Гроднооблимущество»), 230023, г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39, тел. (8 0152) 74 53 86, 72 15 29, 74 53 82 (время работы с 8.30 до 13.00 и с 14.00 до 17.30, кроме выходных и праздничных дней)

1. Аукцион состоится **23 ноября 2009 года в 10.30** по адресу: 230023, г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39.

2. Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми к нему документами принимаются Организатором аукциона по **17 ноября 2009 года до 16.00**, кабинет 6.

3. Сумма задатка перечисляется на расчетный счет Организатора аукциона – Фонда «Гроднооблимущество» № 3642900000187, МФО 152101752 в филиале 400 Гродненского областного управления ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гродно, УНП 500044549.

4. Решение о предоставлении победителю аукциона (претенденту на покупку) земельного участка принимается местным исполнительным комитетом в течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона.

5. Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан в течение 10 рабочих дней со дня принятия местным исполнительным комитетом решения о предоставлении земельного участка внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, расходы, связанные с формированием земельных участков и изменением земельных участков в результате такого формирования, государственной регистрацией в отношении этих участков.

6. После совершения победителем аукциона (претендентом на покупку) указанных действий, но не позднее 2 рабочих дней, с ним в установленном порядке, в соответствии с условиями аукциона, Продавцом заключается договор купли-продажи недвижимого имущества, а местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка.

7. **Подробная информация** – в извещениях о проведении аукциона, ранее опубликованных в газете «Звязда» **6 октября 2009 г. № 188 (26546), 9 октября 2009 г. № 191 (26549)**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ по продаже права на заключение договоров аренды земельных участков в г. Бресте

Адрес участка/ кадастровый номер	ул. 2-я Белорусская, № 140100000001019335	ул. Шоссейная, № 14010000001020247	мкрн. «Вулька-1», ул. Рябиновая, № 140100000001014415	ул. В. Интернационалистов, 19 № 140100000001019530	ул. л-та Рябцева (в р-не станции Брест-Северный) № 140100000001020436	ул. л-та Рябцева (р-н старого аэропорта) № 140100000001020148	ул. В. Интернационалистов, 23 № 140100000001019531
№ лота	1*	2*	3*	4*	5*	6*	7*
Начальная цена продажи (руб.)	140 622 262	33 179 042	31 789 154	29 756 431	182 560 643	114 704 023	36 301 217
Сумма задатка (руб.)	14 000 000	3 317 000	3 178 000	2 975 000	18 256 000	11 470 000	3 630 000
Расх. по подг. земел.-кадастр. док. (руб.)	1 450 817	1 663 968	1 235 300	5 795 970	1 541 102	1 216 304	5 810 313
Общая площадь (га)	0,8704	0,1079	0,0684	0,0673	1,2869	0,2835	0,1056
Срок аренды	10 лет	10 лет	10 лет	10 лет	10 лет	10 лет	10 лет
Целевое назначение	строительство и обслуживание объекта производственного назначения	строительствои обслуживание объекта общественного питания	строительство и обслуживание объекта торговли промышленной группой товаров	строительство и обслуживание объектов социально-бытового назначения, торговли и общественного питания	строительство и обслуживание объекта производственного назначения	строительство и обслуживание объекта административно-хозяйственного назначения	строительство и обслуживание объектов социально-бытового назначения, торговли и общественного питания
Характеристика инженерных коммуникаций и сооружений на участке	0,1041 га – охранная зона канализационного коллектора; 0,0208 га – охранная зона газопровода среднего давления	0,0190 га – охранная зона санитарно-защитная полоса водоводов и водопроводов; 0,0047 га – охранная зона газопровода среднего давления	0,0146 га – охранная зона газопровода низкого давления; 0,0160 га – охранная зона напорной канализации	0,0117 га – охранная зона газопровода среднего давления	ограничений в использовании земель нет	ограничений в использовании земель нет	ограничений в использовании земель нет

Адрес участка/ кадастровый номер	ул. Октябрьской революции – ул. 28 Июля № 140100000001020990	ул. Волгоградская в районе рынка «Ковалево» № 140100000001020989	район индивидуальной застройки «Вычулки-Ямно» № 140100000001021585	район ул. Коммерческая № 140100000001022617	«ЮЗМР-4» № 18а по ГП № 140100000001022681	«ЮЗМР-4» № 19а по ГП № 140100000001022682	пересечение б. Шевченко и Варшавского шоссе № 140100000001023681	район ул. Молодежная № 140100000001024398
№ лота	8*	9*	10*	11*	12*	13*	14	15
Начальная цена продажи (руб.)	1 474 838 992	228 628 011	373 957 964	323 312 090	47 824 428	42 747 422	568 306 568	71 778 780
Сумма задатка (руб.)	147 483 000	22 862 000	37 395 000	32 330 000	4 780 000	4 270 000	56 830 000	7 177 000
Расх. по подг. земел.-кадастр. док. (руб.)	3 178 097	1 429 481	2 636 253	-	755 221	739 422	2 829 516	914 327
Общая площадь (га)	3,5375	0,4910	2,0631	1,7760	0,1234	0,1103	2,0795	1,1014
Срок аренды	10 лет	10 лет	10 лет	25 лет	10 лет	10 лет	10 лет	49 лет
Целевое назначение	строительство и обслуживание объекта торгово-развлекательного назначения, административного назначения, гостиницы с условием создания на прилегающей территории ландшафтно-рекреационной зоны	строительство и обслуживание объекта торговли промышленной группой товаров	строительство и обслуживание объекта многофункционального назначения	строительство логистического центра	строительство и обслуживание магазина продовольственных товаров	строительство и обслуживание магазина продовольственных товаров	строительство и обслуживание объекта торгово-административного назначения	строительство и обслуживание зоны отдыха
Характеристика инженерных коммуникаций и сооружений на участке	ограничений в использовании земель нет	0,0435 га – охранная зона газопровода высокого давления	0,3305 га – охранная зона воздушной линии электропередачи напряжением 10 киловольт; 0,2105 га – охранная зона подземных кабельных линий связи; 0,0240 га – охранная зона воздушных и кабельных линий радиофикации	ограничений в использовании земель нет	ограничений в использовании земель нет	ограничений в использовании земель нет	ограничений в использовании земель нет	1,1014 – охранная зона прибрежных полос водных объектов

***- повторные аукционные торги**

Дополнительное условие по лоту № 10 – возмещение потерь с/х производства в сумме 26 094 700 рублей, вызванных изъятием 2,0631 га пахотных земель; **по лоту № 11** – возмещение расходов связанных с проведением аукциона и формированием земельного участка, в т. ч. с гос. регистрацией в отношении создании земельного участка и потерь с/х производства в сумме 15 705 400 рублей

Условия продажи – внесение победителем аукциона платы за право заключения договора аренды земельного участка; - возмещение расходов, связанных с подготовкой земельно-кадастровой документации и гос. регистрации в отношении создания зем. участков, по лотам 11, 12 возмещение потерь с/х производства; - заключение с Брестским горисполкомом договора аренды зем. участка и осуществление в двухмесячный срок после принятия решения о предоставлении участка гос. регистрации прав на него; - начало освоения зем. участка в течение 6 месяцев с даты проведения аукциона и подписания протокола о его результатах; - получение в установленном порядке разрешения на проведение проектно-изыскательских работ и разработку строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий 2-х лет; - осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией; - снятие плодородного слоя почвы и использование его для нужд, связанных со строительством объекта и на благоустройство г. Бреста

ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ – КУП «БРЕСТСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР ПО УПРАВЛЕНИЮ НЕДВИЖИМОСТЬЮ»

Перечень документов, представляемый потенциальным участником аукциона: заявление на участие в аукционе; заверенную копию платежного поручения о внесении задатка; **гражданином** – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без, нотариального засвидетельствования; **индивидуальным предпринимателем** – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования; **представителем гражданина или индивидуального предпринимателя** – нотариально удостоверенная доверенность; **представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь** – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица, без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица; **представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица** – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык; **представителем иностранного гражданина** – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

Лицо, желающее принять участие в аукционе, обязано подписать с организатором торгов Соглашение, определяющее взаимные права и обязанности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. **Задаток в размере до 10 % от начальной цены объекта перечисляется КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» на р/с № 3012000002678 в филиале № 126 АСБ «Беларусбанк» г. Бреста, код 252, УНП 290433924.** Лицо, желающее участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносит задаток в размере, установленном для предмета аукциона с наибольшей начальной ценой.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462. Для проведения аукциона необходимо наличие не менее 2-х участников. Порядок осмотра объекта осуществляется участником аукциона по согласованию с организатором торгов.

Победитель аукциона обязан:● в течение 10 рабочих дней со дня принятия решения горисполкома о предоставлении ему земельного участка осуществить оплату за аукционный объект и возместить расходы, понесенные городским бюджетом по подготовке земельно-кадастровой документации и государственной регистрации земельного участка; ● заключить с Брестским городским исполнительным комитетом договор аренды земельного участка в установленные законодательством сроки; ● приступить к освоению земельного участка в течение 6 месяцев со дня получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права на него в соответствии с целью и условиями его предоставления (начать строительство, иное освоение земельного участка);● по истечении срока аренды земельного участка, совместно с Брестским городским исполнительным комитетом, в установленном порядке решить вопрос его дальнейшего использования. Оплата за объект может быть произведена в рассрочку в соответствии с порядком, утвержденным решением горисполкома. Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней с даты принятия решения о предоставлении земельного участка возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, окончательный размер которых определяется до аукциона и фиксируется в соответствующих ведомостях ознакомления участников.

Аукцион состоится 15 декабря 2009 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Энгельса, 3, каб. 605. Заявки на участие в аукционе принимаются с 8.30 13.11.2009 г. до 17.30 09.12.2009 г. по адресу: г. Брест, ул. Комсомольская, 46. Контактные телефоны: 23 81 92, 23 45 56, 23 43 48. Сайт: bgcn.by, city.brest.by

Сведения об объектах республиканской собственности, подлежащих разгосударствлению и приватизации

Полное и сокращенное наименование объекта разгосударствления и приватизации, его ведомственная принадлежность			Строительно-монтажное республиканское унитарное предприятие «ТЕПЛОМОНТАЖ» (УП «ТЕПЛОМОНТАЖ»), Министерство архитектуры и строительства Республики Беларусь	Производственно-научное республиканское унитарное предприятие «Минпласт» (УП «Минпласт»), Министерство архитектуры и строительства Республики Беларусь
Адрес			220036, г. Минск, Бетонный проезд, 17	220114, г. Минск, ул. Скорины, 15
Вид деятельности объекта разгосударствления и приватизации, укрупненная номенклатура выпускаемой продукции			Строительно-монтажные работы	Производство строительных изделий из пластмассы
Положение на рынке			Не занимает доминирующее положение	Не занимает доминирующее положение
Планируемые сроки разгосударствления и приватизации			4 квартал 2009 г.	4 квартал 2009 г.
Предполагаемый способ разгосударствления и приватизации			Создание открытого акционерного общества	Создание открытого акционерного общества
Орган, осуществляющий разгосударствление и приватизацию данного объекта, и его местонахождение			Минский городской территориальный фонд государственного имущества 220050, г. Минск, пр. Независимости, 8	Минский городской территориальный фонд государственного имущества 220050, г. Минск, пр. Независимости, 8
Численность работающих, чел.			202	18
Срок предъявлений претензий			Месяц со дня опубликования	Месяц со дня опубликования
Предполагаемый размер уставного фонда создаваемого ОАО, руб.			5 576 362 000	287 562 000
Стоимость основных фондов – всего, руб.			4 369 578 785	146 813 681
Площадь земельного участка, занимаемого объектом, га			4,2471	0,1069
Наличие принадлежащих предприятию долей (паев, акций) в активах других предприятий, руб.			нет	нет
Объекты интеллектуальной собственности в составе нематериальных активов, руб.			нет	нет
Финансовое состояние объекта, руб.	Балансовая прибыль		721 563 751	86 579 037
	Задолженность	кредиторская	2 476 399 069	56 740 048
		дебиторская	2 413

Купляй беларускае!

2. «АКВАДЗІЎ»: САЛОДКАЯ ГРУПА

«Аквадзіў» апошнім часам ператварыўся ў шматпрофільнае прадпрыемства. Вось што гаворыць з гэтай нагоды яго генеральны дырэктар Алег Рымашэўскі:

— Мы зрабілі свой прагноз дзейнасці завода на бліжэйшую і больш далёкую перспектыву з улікам попыту пакупнікоў, верагоднага развіцця іх густаў і патрабаванняў да напояў. І прыйшлі да высновы, што на рынку адносна слаба прадстаўлены айчынныя лікёры, настойкі, бальзамы. У асноўным прадукцыя замежных вытворцаў. Так што ў «Аквадзіва» была перспектыва праявіць сябе ў справе імпартазамяшчэння ў гэтым сегменце прадукцыі. І мы пачалі распрацоўку рэцэптуры групы напояў, якую для сябе назвалі «салодкай». Паралельна заняліся мадэрнізацыяй памяшкання пад цэх настояў траваў і садавіны, закупілі іншае сучаснае абсталяванне для выпуску новых вырабаў. Спачатку бутэлькі для іх завозілі з Расіі, а цяпер нам тару пастаўляе завод з Гродна. Увогуле сёння «Аквадзіў» амаль на сто працэнтаў выкарыстоўвае бутэлькі айчынных вытворцаў, што, дарэчы, для іх з'яўляецца істотнай падтрымкай ва ўмовах крызісу, гаворыць Алег Леанідавіч. Ёсць у гэтым выгада і для «Аквадзіва», бо любая імпартная бутэлька даражэйшая за айчынную.

Купажыст Ала СЫСУН: «Водар гэтых жывых фруктаў мы перадаем нашай прадукцыі».

У купажным аддзяленні.

«Салодкая група» ў асноўным сфарміравалася сёлета ў сярэдзіне года. Але яна — пяць назваў лікёраў і пяць назваў настоек — ужо ўяўляе сабой новы від прадукцыі «Аквадзіва». Сёння ніводны від гэтай прадукцыі не залежваецца на складзе. Адны вырабы разыходзяцца даволі хутка, некаторыя не адразу, але знаходзяць свайго пакупніка. Карацей, рэалізацыя поўная. Тут трэба зрабіць адну важную заўвагу: новыя вырабы «Аквадзіва» амаль адразу знайшлі свайго пакупніка шмат у чым дзякуючы папярэдняй шматгадовай і няспыннай рабоце над прывабным іміджам сваёй гандлёвай маркі. Спажыўцы прывыклі, што пад ёй прапаноўваецца толькі якасны прадукт. Каб не расчараваць прыхільнікаў сваёй маркі, на заводзе сур'ёзна паставіліся да падрыхтоўкі вытворчага працэсу «салодкай групы». Алег Рымашэўскі расказвае:

— Спачатку выпусцілі партыю бальзаму. Прадукт атрымаўся якасны. Гэта, дарэчы, пацвердзіў і наш удзел у прэстыжнай міжнароднай выстаўцы-кірмашы, адкуль нашы спецыялісты прывезлі залаты медаль. Залатым медалём бальзам быў узнагароджаны і на міжнароднай выставе ў наступным годзе. Яго ацаніў і наш спажывец, што асабліва прыемна, — дзеліцца думкамі кіраўнік.

Такім чынам, з'явіліся ўмовы для вытворчасці шырокага асартыменту настояў і лікёраў. Вось і цяпер у вырабах «салодкай групы» прысутнічаюць выключна натуральныя інгрэдыенты. Напрыклад, толькі натуральны лімон выкарыстоўваецца для вырабу напояў са смакам і водарам лімона, апельсіна, аніса і іншых экзатычных пладоў і ягад. Сёлета наладзілі выпуск настоек салодкіх і паўсалодкіх з невялікім утрыманнем алкаголю. Напрыклад, вішнёвы лікёр, лікёр «палын з мёдам» і г.д. Гэта напоі для дам. Таксама «Аквадзіў» асвоіў выпуск дэсертных і больш моцных лікёраў.

А для салідных мужчын «Аквадзіў» распачаў разліў якасных каньякоў. Гэта ўкраінскі каньяк завода «Таўрыя» і каньякі двух грузінскіх заводаў: «Напарарыўлі 21» і «Кварэльскі склеп». З каньяком, відаць па ўсім, «Аквадзіў» таксама трапіў у «яблычак». Згодна са статыстыкай перадкрызісных часоў, у параўнанні з іншымі моцнымі напоямі рос апераджальнымі тэмпамі попыт на каньякі. А яго, як вядома, неразборлівыя ў напоях людзі не ўжываюць. Прапанаваць гэтыя напоі калі не айчыннай вытворчасці, дык пад беларускай маркай — справа, выгадная як самому прадпрыемству, так і дзяржаве.

Па словах дырэктара завода, перавагі шматпрофільнага прадпрыемства, у якое паступова ператварыўся «Аквадзіў», дапамагае яму лепш манеўраваць на спажывецкім рынку краіны. Выпуск розных відаў прадукцыі дазваляе рабіць акцэнт на вытворчасці тых вырабаў, якія сёння лепш прадаюцца. Летам і вясной, скажам, гэта мінеральная і пітная вада, віно, зімой і восенню — моцныя напоі. Такая арыентацыя на густы пакупніка прыносіць плён. І на заводзе не памыліліся, калі ў сваіх стратэгічных планах зрабілі стаўку на выпуск салодкай групы, яе ўдзельная вага ў аб'ёмах апошнім часам значна ўзрасла.

Леанід ТУГАРЫН.
Яўген ПЯСЕЦКІ (фота).

УНП 600391513.

— Якасць прадукцыі заўжды пад кантролем, паведаміла нам інжынер-лабарант Ірына ДЗЯТКО.

ПРАЗМЕРНАЕ ЎЖЫВАННЕ АЛКАГОЛЮ ШКОДЗІЦЬ ЗДАРОЎЮ

Тэлесеткі

НА КАНАЛЕ «ЛАД» ЗРОБЯЦЬ ПАРОДЫЮ... НА САМІХ СЯБЕ

Тэлепраект «Смешная часінка» з'явіцца на экране ўжо напрыканцы лістапада. «Гэта будзе пародыя на «Беларускую часінку» — тыя ж навіны, рэпартажы, апытанні і тэлефонныя званкі ў прамым эфіры, але ў гумарыстычным рэчышчы», — расказаў дырэктар дырэкцыі тэлеканала «ЛАД» Сяргей Кухто.

Для ўдзелу ў гэтым своеасаблівым серыяле цяпер падбіраюць прафесійных акцёраў, знешне падобных да вядучых «Беларускай часінкі». Напрыклад, двайнік Канстанціна Юманава, які віртуозна капіруе жэсты і міміку вядучага, ужо знойдзены, іншых герояў пародыі яшчэ шукаюць. У напісанні сцэнарыя праграмы задзейнічаны вопытныя гульцы ў КВЗ, якія ўжо «засвяціліся» ў рабоце над папулярнымі расійскімі тэлепраектамі, а ў здымках — высокапрафесійныя грымёры з кінастудыі, задача якіх зрабіць «копію» і «арыгінал» практычна неадрознымі. Вядучыя, якіх дзеля падбору двайнікоў абмералі і сфатаграфавалі з усіх ракурсаў, жартуюць, што так старанна двайнікоў робяць толькі для партыйных чыноў.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

А ПІВА ПАВІННА БЫЦЬ «САПРАЎДНЫМ»!

Лінейка брэнда «Крыніца» папоўнілася новым гатункам піва. «Крыніца Сапраўднае» было зварана з улікам меркаванняў і перавагаў саміх спажыўцоў.

Яшчэ ў чэрвені па ініцыятыве групы прадстаўнікоў грамадскасці, аб'яднаных ідэяй стварэння нацыянальнага беларускага гатунку піва высокай якасці з натуральных кампанентаў, узнік «Усебеларускі рух «За нармальнае піва!» Ініцыятыва была падтрыманая найбуйнейшай айчыннай піваварнай кампаніяй, якая выказала гатоўнасць зварыць той новы гатунак пеннага напою, за які прагаласуе спажывец. Дэгустацыі праходзілі ў буйных гарадах краіны, у мерапрыемствах удзельнічалі «півазнаўцы» — адабраныя з ліку аматараў піва сапраўдныя знаўцы густу. Менавіта яны і выбралі той гатунак, які павінен стаць народным. Сама назва была вызначана па выніках інтэрнэт-галасавання.

Сяргей СТАРЫНАЎ.

СЁННЯ

Месяц
Апошняя квадра 9 лістапада. Месяц у сузор'і Шаляў.

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	7.31	16.16	8.45
Віцебск —	7.26	16.00	8.34
Магілёў —	7.21	16.06	8.45
Гомель —	7.12	16.08	8.56
Гродна —	7.45	16.32	8.47
Брэст —	7.40	16.38	8.58

Імяніны
Пр. *Алены, Анастасіі, Леаніда, Марка, Мацвея, Сцяпана.*
К. *Рэнаты, Вітольда.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Дзве даты

12 лістапада

1823 год — нарадзіўся (в. Шыпілавічы Бабруйскага павета) Павел Міхайлавіч Шпілеўскі, беларускі этнограф, фалькларыст, пісьменнік, публіцыст, тэатральны крытык. Супрацоўнічаў з пецярбургскімі перыядычнымі выданнямі. Вывучаў гісторыю, побыт, вусную народную творчасць і мову беларусаў. Самымі значнымі і найбольш поўнымі публікацыямі пра Беларусь былі серыя артыкулаў «Беларусь у характарыстычных апісаннях і фантастычных яе казках» і «Вандраванне па Палессі і Беларускаму краю». Яны прынеслі аўтару вядомасць як аднаму з першых даследнікаў і папулярызатараў беларускай гісторыі і фальклору. Аўтар зборнікаў «Беларускія народныя павер'і», «Народныя прыказкі з тлумачэннем паходжання і значэнні іх», «Беларускія прыказкі», аповесці «Цыганок», п'есы «Дажынкі» (па матывах «Ідылій» В.Дуніна-Марцінкевіча).

1840 год — нарадзіўся Агюст Радэн, славуты французскі скульптар і графік («Мысліцель», «Адам», «Ева», «Грамадзяне Кале» і інш.), творчасць якога аказала найвялікшы ўплыў на далейшае развіццё сусветнай скульптуры.

Цытата дня:

«Або тое, што сам ведаеш, перадай іншым; або тое, чаго не ведаеш, ад іншых вазьмі!».
Аухад ад-дзін Анвары (1118—1191), персідскі паэт.

«ВОСЬ ТАБЕ СЕРАБРО...»

Даволі часта грошы, а дакладней, манеты выступалі як адзін з рытуальных прадметаў у сямейнай і каляндарнай абраднасці ўсходніх славян. Так, падчас пахавання кідалі ў магілу, а часам клалі ў труну некалькі манет, тым самым быццам бы «выкуплялі» пераправу на той свет.

● Калі падчас пахавання нябожчык расплюшчваў вочы, яму на павекі клалі манеты. Лічылася, што расплюшчаныя вочы нябожчыка «выглядваюць» чарговую ахвяру.

● Грашыма (некалькімі манетамі) «адкупляліся» ад тых, каго сустракалі на шляху да могілкаў.

● Грошы прысутнічалі на вяселлі: падчас сватаўства, змовы, выкупу нявесты, пры шлюбе, падчас дзялення каравая. Ва ўсіх сітуацыях грошы сімвалізавалі багатае жыццё маладой сямейнай пары.

● Падчас вянчання ў храме нявеста падкладвала пад правую пяту пятак і загадвала, каб жыццё прайшло ў багацці і шчасці.

● Манеты з-за ўласцівасці металу, з якога яны былі выраблены, сімвалізавалі шэраг уласцівасцяў і якасцяў, напрыклад, здароўе, пладавітасць і г.д. Так, на вяселлі дарылі медныя манеты і прымаўлялі: «Дарунку медзі, каб дзеці былі, як мядзведзі». Або так: «Вось табе серабро, каб мець дабро. Вось табе медзь, каб дзяцей мець».

● Каб быць з «чыстым» таварам, г.зн. прыгожым, здаровым, на Вялікдзень мыліся «праз срэбра», г.зн. у ваду клалі сярэбраную манету.

● Пры першым наведванні парадзіхі і немаўляці жанчыны, якія ішлі ў адведкі, павінны былі прынесці ў хату палатна на «пялёнкі» і некалькі манет.

● Пры першым рытуальным купанні дзіцяці ў начоўкі клалі медную або сярэбраную манету: клапаціліся пра будучыню, дабрабыт і здароўе малога.

● Падчас хрэсьбінаў бацькі адорвалі бабку-павітуху грашыма, а кумы выкупляліся «бабіну» кашу — плацілі грошы.

● На Каляды калядоўшчыкам, на Вялікдзень валачобнікам абавязкова давалі некалькі манет за выкананне песень-віншаванняў.

● Манеты выкарыстоўвалі падчас Каляднай варажбы: запякалі ў хлебе, клалі ў чыгун з кашай, пад падушку, у крынічную ваду. Ва ўсіх сітуацыях той, хто станавіўся ўладальнікам гэтай незвычайнай манеты, лічыўся ўдачлівым на працягу года: яго мары абавязкова спраўдзяцца.

● На Купалле пастух плёў вянкі, а ўвечары кожная гаспадыня, у якой была карова, павінна была «купіць» у пастуха вянок за некалькі манет.

● Пры будаўніцтве хаты ў падмурак абавязкова закладвалі аднудзве манеты і прымаўлялі: «Каціся ў кут, серабро, у хату на дабро».

● Падчас уваходзінаў ці ўлазінаў разам са збожжам на падлогу кідалі і некалькі манет, пры гэтым гаварылі так: «Выкупляю хату не жыхарамі, а грашамі».

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Крынічка

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Рубрыку вядзе Валянціна ШПІЛЕЎСКАЯ, тэл. 285 88 81 № 38 (327)

Веснавыя прышчэпкі

«Як правільна захоўваць чаранкі для веснавой прышчэпкі?»
В. Трус, *г. Барысаў.*

Асабліва складана захаваць чаранкі костачкавых раслін. Аптымальнай тэмпературай захоўвання лічыцца мінус 2 — мінус 4 градусы. Звычайна рэкамендуецца захоўваць чаранкі ў снежных буртах пад слоем снегу. Але на нашы зімы спадзявацца не прыходзіцца. Бывае, што на працягу зімы снег неаднаразова поўнасцю растае, а затым б'юць маразы, у выніку чаго чаранкі падмярзаюць. Такім чынам, у раёнах з частымі адлігамі нарыхтаваныя чаранкі трэба звязаць, засыпаць мокрым пілавіннем і пакласці на мароз — так раяць практыкі. Пасля намарожвання слою пілавіння таўшчынёй 15—20 см чаранкі ўкладваюць на зямлю з паўночнага боку дома так, каб на іх не падалі сонечныя прамені, і яшчэ засыпаюць зверху сухім пілавіннем слоем 30—40 см. Усю кучу пакрываюць поліэтыленавай плёнкай, якая засцеражэ пілавінне ад намакання. Пілавінне валодае цеплаізаляцыйнымі ўласцівасцямі і чаранкі застаюцца ў замарожаным стане аж да самага часу прышчэпкі.

Некаторыя садаводы захоўваюць чаранкі ў падвале ў вільготным пяску. Гэтым спосабам можна карыстацца для захоўвання чаранкоў семачкавых культур і вінограду, але ён не прыдатны для костачкавых.

Калі чаранкоў нямнога, іх можна трымаць у халадзільніку на верхняй паліцы пад маразільнай камерай. Чаранкі змяшчаюць у поліэтыленавы пакет, шчыльна абмотваюць яго шпагатам і завязваюць. Затым з другога канца надзяваюць яшчэ адзін пакет і таксама завязваюць.

Санберы — і лекар, і кармілец

«Раскажыце пра такую расліну, як санберы і пра тое,чым яна карысная».
М.М. Іваноў, *Карэліцкі раён.*

Санберы — гэта паслён, акультураны больш як 100 гадоў таму амерыканскім селекцыянерам. Культурны санберы — гэта аднагадовая магутная расліна вышынёй да 2 м, якая мае шмат галінак. Ягады чорныя, вялікія, да 2 см у дыяметры. Куст у працэсе росту робіцца галінастым. Садзіць расліны трэба рэдка — да 1 м адна ад другой. Завязі на кустах з'яўляюцца пачынаючы ад самай зямлі і да самай верхавінкі. На кожнай галінцы іх сотні, а на ўсім кусце іх да тысячы штук. Прычым завязванне і выспяванне ягад ідзе няспынна да сярэдзіны кастрычніка. Пасля таго як ягады пачарнеюць, трэба пачакаць яшчэ тыдні два-тры, калі яны даспеюць і стануць пруткімі. Цвёрдыя ягады аддзяліць, яны даспеюць у пакоі ў цяпле. Ягады, зрэзаныя на гронках, можна захоўваць у халадзільніку да Новага года.

Санберы — расліна непатрабавальная, вытрымлівае холад, засуху, недахоп угнаенняў, але калі пасадзіць на сонечнае месца, своечасова паліваць і падкормліваць, з куста можна сабраць да 20 кг ягад. Агратэхніка вырошчвання такая, як у таматаў.

У свежым выглядзе смак ягад санберы даволі прэсны, але пасля маразоў ягады робяцца больш салодкімі. Але галоўная іх вартасць — гаючасць. Яны змяшчаюць многа пекцінаў, якія выводзяць яды з арганізма, антацыяны, якія паляпшаюць састаў крыві. У склад ягад уваходзіць такі жыццёва важны для арганізма чалавека мікраэлемент, як селен. Дапамагаюць плады санберы пры страўнікава-кішачных захворваннях, гемароі, падагры, галаўным болі, рэўматызме, садзейнічаюць паляпшэнню зроку.

Карысна, вядома, есці свежыя ягады. Перад ужываннем іх трэба абдаць кіпенем — будзе смачней. Тыя, хто ўжывае ягады санберы, лічаць, што дастаткова есці па 5-6 ягад на працягу месяца, каб пазбавіцца ад гіпертанічнай хваробы. Жменьку расцёртых ягад у выглядзе кампрэсаў накладваюць на хворыя ногі — дапамагае пры варыкозным расшырэнні венаў. Ягады не губляюць сваіх лекавых уласцівасцяў у варэнні. Калі кожны дзень ужываць да 5 сталовых лыжак варэння, то гэта садзейнічае зніжэнню ціску ў крыві, выводзіць з арганізма яды і шлакі.

Варэнне з санберы можна варыць па рознаму: расцерці ягады або цэлымі заліць сіропам. Норма цукру 1-1,2 кг на 1 кг ягад. Для прымянення варэння ў лекавых мэтах норму цукру трэба знізіць да 300 г па 1 кг ягад, абавязкова дадаць дробна парэзаны лімон. Лекавае варэнне даводзяць да кіпення, затым пакідаюць на 12 гадзін у эмаліраванай каструлі з закрытай накрыўкай. Захоўваць варэнне трэба ў халадзільніку.

З ягад санберы атрымліваецца добрае віно. На 10-літровую пасудзіну патрабуецца 3,5 кг расціснутых ягад і 3 кг цукру. Змесціва даліваюць астуджанай гатаванай вадой, даюць перабродзіць без доступу кіслароду. Праз месяц віно гатовае. Яно таксама валодае лекавымі ўласцівасцямі. З ягад можна прыгатаваць лекавы сок з дабаўленнем мёду. Сок напалову разводзяць вадой і на 5 л гэтай сумесі дадаюць 1 л мёду, захоўваюць у халадзільніку. Для лячэння дастаткова прыняць перад ядой па адной сталовай лыжцы.

Кветкі ў інтэр'еры

У прыродзе жыццёвы рытм, знешні выгляд раслін вызначаюць у першую чаргу тэмпература, святло, вільготнасць, глеба, уплыў суседніх раслін, а вось ва ўмовах памяшканняў на жыццядзейнасць кветак вялікі ўплыў робіць чалавек.

Не ўсе расліны аднолькава патрабавальныя да тэмпературы і вільготнасці паветра, святла ва ўмовах памяшканняў. Зыходзячы з гэтага, непатрабавальныя да святла трэба размяшчаць далей ад акон. На падваконні бліжэй да святла паставім святлалюбныя расліны, якія прыгожа цвітуць (напрыклад, **калеус**). У вітальнях, дзе на расліны ўздзейнічае паветра, размесцім віды, устойлівыя да скразнякоў і зацянення: **лаўр, самшыт, хамеропс** і інш.

Для пакаёвых кветак можна выкарыстаць падстаўкі ў выглядзе этажэрак, размяшчаючы на іх адразу па некалькі відаў раслін, якія аднолькава рэагуюць, напрыклад, на асвятленне.

Кветкі могуць прыгожа выглядаць у кампазіцыях і абавязковая ўмова — улічваць іх патрабаванне да святла, тэмпературы і вільготнасці паветра, а таксама браць пад увагу памеры раслін, афарбоўку іх лістоў, характар цвіцення, біялагічную і экалагічную сумяшчальнасць.

Кампазіцыі могуць быць як сіметрычнымі, так і асіметрычнымі. Галоўнае, каб кожная такая кампазіцыя мела сваю дамінанту, гэта значыць расліну, якая акцэнтуе ўвагу. Як асноўную расліну добра выкарыстоўваць **манстэру, пальму, філадэндрон**.

Падбор раслін для памяшканняў павінен будавацца на кантрастах. Напрыклад, у інтэр'еры з цёмнай мэбляй унясуць ажыўленне расліны з яркімі і стракатымі лістамі, а таксама кветкі, якія прыгожа цвітуць (**азалія**), лісцёва-дэкаратыўныя (**дыфенбахія, аглаанема, драцэна**). У прасторных памяшканнях добра выглядаюць пальма, фікус, манстэра.

Невялікія пакойчыкі лепш упрыгожыць ампельнымі раслінамі, вертыкальнае размяшчэнне якіх амаль не патрабуе дадатковай плошчы. Тут падыдуць **сцындапсусы, філадэндроны, плюшчы** і інш. Да месца будуць тут і кампазіцыі з сукулентных раслін (**кактусаў, седумаў** і інш).

У доўгіх і вузкіх пакоях расліны трэба размяшчаць так, каб яны скрадвалі даўжыню памяшкання. Калі памеры пакоя дазваляюць, можна ўводзіць дадатковыя элементы ў выглядзе дэкаратыўных рашотак ці апораў з дрэва, кантэйнераў, ваз, якія дазваляюць падзяліць пакой на асобныя ўчасткі.

У памяшканнях з паўночнага боку можна размяшчаць выхадцаў з вільготных тропікаў, якія растуць пад полагам лесу (**фікусы, плюшчы звычайныя** і інш.) У памяшканнях з усходняга боку можна вырошчваць розныя віды **бегоній, язмінь, самбак, лімон, страліцыю, аспарагус**. Калі вокны памяшкання выходзяць на захад, камфорт і ўтульнасць створаць **гемантус, санхезія, панданус, афеляндра, дыфенбахія, сенполія, кіпарыс вечназялёны пірамідальны**.

ГЭТА ЦІКАВА

Ці ведаеце вы, колькі гадоў можа захоўвацца пшанічнае зярнятка? Некалькі тысячагоддзяў! Пра гэта сведчыць зерне, знойдзенае ў грабніцах егіпецкіх фараонаў. Але больш за ўсё здзіўляе тое, што гэтыя зярняты захавалі здольнасць прарастаць і даваць жыццё новым раслінам.

Вучоныя лічаць, што радзімай пшаніцы з'яўляюцца краіны Паўднёва-Заходняй Азіі. Плугоў тады не было. Старажытныя земляробы вострымі сукамі і палкамі аралі глебу, у якую кідалі насенне. Спелыя пшанічныя зярняты нашы продкі ўжывалі ў ежу ў сухім выглядзе. Шмат вякоў мінула пакуль чалавек здагадаўся змалоць пшанічныя зярняты на муку і спёк першы праснак. Праз некаторы час людзі навучыліся выпякаць сапраўдны пшанічны хлеб.

Зіма спытае, што восень назапасіла

Караняплоды, капуста — быццам бы ўсё папарадкавалі і паціху пачынаем браць з засекаў ні пра што не хвалюючыся. Але практыка паказвае, што толькі ў таго гаспадара хапае ўраджаю на ўсю зіму, хто клапоціцца пра ўраджай і зімой. Трэба рэгулярна правяраць, ці добра захоўваецца ў склепах, падвалах ці сховішчах бульба і агародніна, як адчуваюць сябе летнія нарыхтоўкі агуркоў, памідораў, салатаў і інш.

Капуста ў перыяд захоўвання моцна пашкоджваецца шэрай гніллю. Заражэнне адбываецца яшчэ ў полі, часцей за ўсё ў канцы лета. Моцныя дажджы, шчодрыя росы, розныя пашкоджанні, а таксама падмарожванні садзейнічаюць хуткаму развіццю хваробы. Яна пачынае праяўляцца на ніжніх лістах, часцей за ўсё там, дзе лісце мацуецца да храпкі. У перыяд захоўвання пры павышанай тэмпературы і вільготнасці на паверхні пашкоджаных качаноў з'яўляецца шэры пушысты налёт. Хвароба пераходзіць з хворых качаноў на здаровыя.

Пачынаць змагацца з шэрай гніллю трэба яшчэ да збору ўраджаю і закладкі яго на захоўванне. Захоўваць агратэхніку пры вырошчванні, больш познія тэрміны сяўбы і пасадкі расады на пастаяннае месца. Не менш важна знішчаць раслінныя рэшткі, ачышчаць і дэзынфіцыраваць сховішчы, а таксама захоўваць аптымальны рэжым захоўвання: ад 0 да мінус 1 градуса. Пры першых прыкметах захворвання пашкоджаныя лісты трэба зняць. Не варта выкарыстоўваць заражаныя раслінныя рэшткі ў кампосных кучах.

У час захоўвання **морква** пашкоджваецца многімі хваробамі. Вялікую шкоду наносіць белая гніль. Караняплоды пашкоджваюцца грыбком яшчэ ў полі, але на расліне, якая расце, ён развіваецца слаба. І толькі пасля ўборкі хвароба пачынае прагрэсаваць. Караняплоды размякчаюцца і літаральна на вачах пакрываюцца густым белым налётам. Хвароба развіваецца пры тэмпературы 0 градусаў, а тым больш пры 15—20 градусах і высокай вільготнасці. Асноўная крыніца інфекцыі — глеба, дзе ўзбуджальнік хваробы захоўваецца доўгія гады. Таму не варта з году ў год вырошчваць моркву на адным і тым жа месцы. На ўчастак морква не павінна вяртацца не раней чым праз 3-4 гады. З ліку папярэднікаў трэба выключыць расліны, якія пашкоджваюцца белай і шэрай гніллю. Гэта таматы, агуркі, капуста. Для барацьбы з гэтай хваробай праводзяць восенскую перакопку на глыбіню больш як 15 см.

У час захоўвання **буракоў** важна таксама выбіраць хворыя экзэмпляры. У зімовы перыяд высокая тэмпература і вільготнасць, а таксама наяўнасць святла садзейнічаюць з'яўленню парастакаў у бураках. Як толькі гэтыя фактары будуць ліквідаваныя, спыніцца рост буракоў.

У зімовы час варта падумаць пра насенне. Але, перш чым набываць новыя пакецікі з насеннем, правядзіце рэвізію таго, што ў вас ёсць. Самы час падумаць пра набыццё сродкаў аховы раслін, а таксама папоўніць запасы мінеральных угнаенняў. У маі яны вам спатрэбяцца.

Усміхнемся!

Два сябры.

— Уяўляеш? Кожны дзень сваркі! То ложак не прыбраў, то сабаку не выгуляў, то посуд не памыў, то зарабляю мала!

— Так, а па твары?

— Ды не, рукі, дзякуй Богу, яшчэ не распускае...

☺

Добра цяпер у метро. Чхнуў — адразу свабоднае месца!

☺

У краме.

— Дайце бутэльку гарэлачкі, калі ласка.

— Мужчына, вы на гадзіннік глядзелі? Гарэлку мы пасля 23.00 не прадаём!

— Сволачы! Ды я гадзіннік прадаў, каб гэтую гарэлку купіць!

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год. Тыраж 32.345. Індэкс 63850. Зак. № 6209. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12